ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 87 (2036)
29 кастрычніка 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ТВАРЫЦЬ ДЛЯ НАРОДА, ТВАРЫЦЬ НА СТАГОДДЗІ

27 кастрычніка ў Маскве адкрыўся IV Усесаюзны з'езд архітэктараў. Яго работа праходзіць у гістарычныя дні падрыхтоўкі да XXIII партыйнага з'езда, у дні, калі савецкі народ паспяхова завяршае выкананне сямігадовага плана, ажыццяўляе рашэнні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС.

У Вялікім Крамлёўскім Палацы сабраліся архітэктары з усіх рэспублік краіны. Сярод 500 дэлегатаў з'езда — славутыя архітэктары і маладыя горадабудаўнікі. У зале шматлікія госці — будаўнікі, дзеячы навукі і культуры, прадстаўнікі партыйных і грамадскіх арганізацый. У многіх удзельнікаў з'езда на грудзях ордэны, знакі лаўрэатаў Дзяржаўнай і Ленінскай прэмій — сведчанне прызнання народам высокіх заслуг архітэктараў.

Цёпла сустракаюць дэлегаты і госці з'езда таварышаў А. М. Шалепіна, В. В. Грышына, П. Н. Дзёмічава, Б. М. Панамарова, А. П. Рудакова, якія з'явіліся ў ложах.

10 гадзін раніцы. Старэйшы архітэктар краіны, Герой Сацыялістычнай Працы В. Г. Гельфрэйх адкрывае з'езд.

Дэлегаты аднадушна выбіраюць ганаровы прэзідыум з'езда ў саставе Прэзідыума ЦК КПСС.

Выбіраюцца рабочыя органы з'езда, зацвярджаецца парадак дня. Дэлегаты заслухаюць і абмяркуюць справаздачу праўлення Саюза архітэктараў СССР, справаздачу Рэвізійнай камісіі, выберуць новыя кіруючыя органы саюза.

Сакратар ЦК КПСС А. П. Рудакоў зачытвае прывітанне з'езду Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР. Дэлегаты і госці сустракаюць прывітанне бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Слова для даклада па першаму пытанню парадку дня атрымлівае першы сакратар праўлення Саюза архітэктараў СССР Г. М. Арлоў. Ён расказаў аб вялікім творчым шляху, які прайшлі горадабудаўнікі Савецкага Саюза за апошнія чатыры гады пасля III з'езда архітэктараў.

З дакладам Рэвізійнай камісіі выступіў старшыня камісіі В. Сімбірцаў.

Першым у спрэчках выступіў старшыня Маскоўскага аддзялення Саюза архітэктараў СССР Н. Селіванаў. Затым слова ўзяў старшыня праўлення Саюза архітэктараў Украіны Г. Галаўко.

28 кастрычніка ў Вялікім Крамлёўскім Палацы працягваў сваю работу чацвёрты з'езд савецкіх архітэктараў. Ідзе гутарка аб праблемах архітэктуры, аб прыгажосці гарадоў і сёл нашай Радзімы, аб выгодах савецкага чалавека.

Выступаючы на ранішнім пасяджэнні з'езда, старшыня Дзяржаўнага камітэта па грамадзянскаму будаўніцтву і архітэктуры М. Пасохін спыніўся на важнейшых задачах горадабудаўнікоў. Адна з іх—складанне генеральных планаў развіцця індустрыяльных цэнтраў. Ён адзначыў, што горадабудаўнікі Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска накапілі значны вопыт.

Старшыня праўлення Саюза архітэктараў Узбекістана А. Бабаханаў расказаў аб вялікім будаўніцтве, якое вядзецца ў рэспубліцы. Аб праблемах ідэйна-мастацкага напрамку савецкай архітэктуры гаварыў старшыня праўлення Саюза архітэктараў Армянскай ССР В. Аруцюнян.

З вялікай увагай дэлегаты з'езда выслухалі выступленне намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржбуда СССР І. Т. Новікава.

ТАСС.

На паліцах музычнага аддзела Цэнтральнага універмага Мінска ёсць грамзапісы гістарычнай прамовы Ул. І. Леніна «Што такое Савецкая ўлада», успаміны Н. Крупскай, Я. Яраслаўскага, А. Стасавай, Ф. Кона, Ул. Бонч-Бруевіча пра вялікага правадыра. Гэтыя грамзапісы карыстаюцца попытам у наведвальнікаў.

На здымку — прадавец аддзела А. Неліповіч падбірае грамзапісы.

Фота Ул. КРУКА.

ЧАЦВЁРТАМУ ЎСЕСАЮЗНАМУ З'ЕЗДУ САВЕЦКІХ АРХІТЭКТАРАЎ

Дарагія таварышы!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савет Міністраў СССР горача вітаюць удзельнікаў чацвёртага Усесаюзнага з'езда савецкіх архітэктараў і ў вашай асобе ўсіх дойлідаў нашай краіны.

Партыя і ўвесь савецкі народ высока цэняць стваральную працу архітэктараў і будаўнікоў. Толькі за гады сямігодкі пабудавана больш як пяць з палавінаю тысяч новых прамысловых прадпрыемстваў. У вялікіх маштабах вядзецца жыллёвае будаўніцтва. За адзін год цяпер у нас будуецца столькі ж кватэр, колькі было пабудавана за восем даваенных гадоў, разам узятых.

Гэтым поспехам у значнай меры садзейнічае новая прагрэсіўная накіраванасць савецкай архітэктуры, заснаваная на індустрыялізацыі будаўніцтва. Праектуемыя дамы і збудаванні ўсё паўней адпавядаюць патрабаванням сучаснай вытворчасці, запатрабаванням быту і культуры працоўных.

Шырокі размах будаўніцтва, імклівае развіццё навукі і тэхнікі, растучыя запатрабаванні савецкага грамадства патрабуюць далейшай мабілізацыі творчых сіл і талентаў архітэктараў для новых здзяйсненняў, вартых нашага народа. Зручнасць, прыгажосць гарадоў і вёсак, дамоў і збудаванняў, рацыянальная планіроўка, строгасць і мастацкая выразнасць архітэктурных форм, арганічна звязаных з канструкцыямі, матэрыяламі і індустрыяльнымі метадамі будаўніцтва, эканамічнасць павінны стаць характэрнымі рысамі савецкай архітэктуры.

Найпершы абавязак савецкіх архітэктараў, вучоных, інжынераў, будаўнікоў і работнікаў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — рэзка павысіць якасць архітэктуры і будаўніцтва.

Асаблівы клопат архітэктары павінны праяўляць аб якасці масавага жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва, удасканаленні архітэктуры тыпавых жылых і грамадскіх будынкаў, аб паляпшэнні планіроўкі кватэр і іх добраўпарадкаванні. Развіццё вытворчасці новых матэрыялаў і канструкцый адкрывае вялікія магчымасці для ўзвядзення прыгожых сучасных дамоў і збудаванняў.

Дойліды закліканы ствараць выразныя архітэктурныя ансамблі жылых раёнаў на аснове творчага прымянення ў забудове тыпавых жылых дамоў і грамадскіх будынкаў, разнастайных планіровачных рашэнняў, выкарыстання лепшых нацыянальных традыцый дойлідства народаў нашай краіны.

Трэба павысіць мастацка-ідэалагічнае значэнне архітэктуры, аддаваць вялікую ўвагу пытанням сінтэзу архітэктуры і выяўленчага мастацтва, што будзе садзейнічаць узмацненню ідэйна-выхаваўчай ролі архітэктуры ў жыцці народа.

Пры праектаванні прадпрыемстваў трэба імкнуцца да стварэння прамысловых вузлоў і комплексаў, якія забяспечвалі б значнае зніжэнне кошту будаўніцтва, дамагацца найбольш рацыянальных архітэктурных рашэнняў вытворчых будынкаў з улікам патрабаванняў тэхнічнай эстэтыкі, што садзейнічала б паляпшэнню ўмоў працы і павышэнню яе прадукцыйнасці.

Сельскія будаўнікі чакаюць ад архітэктараў эканамічных тыпавых праектаў жылых, грамадскіх і вытворчых будынкаў, якія ўлічылі б спецыфіку сельскагаспадарчай вытворчасці і быту насельніцтва, разлічаных на максімальнае выкарыстанне мясцовых будаўнічых матэрыялаў.

Удасканальваючы праектаванне, неабходна павышаць асабістую адказнасць кожнага архітэктара за эфектыўнае выкарыстанне капітальных укладанняў, своечасовае забеспячэнне будоўляў высакаякаснымі праектамі і больш поўную рэалізацыю рэзерваў ва ўсіх галінах будаўніцтва. Важна, каб у стварэнні тыпавых праектаў удзельнічалі вядучыя, найбольш вопытныя і таленавітыя майстры архітэктуры.

Далейшая распрацоўка актуальных праблем савецкага дойлідства патрабуе ўсебаковага развіцця тэорыі архітэктуры. На аснове марксісцка-ленінскага аналізу тэндэнцый грамадскага развіцця навука заклікана раскрываць шляхі прагрэсу архітэктурна-будаўнічай практыкі.

Творчая дзейнасць савецкіх дойлідаў мае вялікае сацыяльнае і грамадскае значэнне. У сваёй рабоце архітэктары павінны паўней выкарыстоўваць перавагу сацыялістычнай сістэмы, якая дазваляе вырашаць задачы савецкага горадабудаўніцтва з улікам перспектыў развіцця вытворчых сіл краіны, найбольш мэтазгоднага размяшчэння прамысловых і жылых зон, ствараючы тым самым найлепшыя жыццёвыя ўмовы для насельніцтва.

Паспяховае вырашэнне задач, якія стаяць перад архітэктарамі, у многім залежыць ад работы Саюза архітэктараў СССР. Саюз закліканы садзейнічаць фарміраванню творчай накіраванасці савецкай архітэктуры, павышэнню прафесіянальнага майстэрства нашых дойлідаў, клапатліва выхоўваць маладыя кадры архітэктараў, садзейнічаючы іх ідэйнаму і творчаму росту. Дзейнасць Саюза архітэктараў павінна быць накіравана на хутчэйшае ўкараненне ў практыку ўсяго перадавога, прагрэсіўнага, што ствараецца працаю вучоных, праекціроўшчыкаў і будаўнікоў, на стварэнне архітэктуры, якая адпавядала б карэнным інтарэсам народа і адлюстроўвала б веліч яго барацьбы за камунізм.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савет Міністраў СССР жадаюць чацвёртаму Усесаюзнаму з'езду архітэктараў плённай работы і выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што савецкія архітэктары ўнясуць варты ўклад у ажыццяўленне праграмы будаўніцтва камунізма ў нашай краіне.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС
САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР

З уздымам працуе на будаўніцтве Гомельскага суперфасфатнага завода камсамольска-маладзёжная брыгада, якую ўзначальвае Анатоль Братушка. Калектыў са значным апераджэннем графіка вядзе мантаж электрафільтраў прамыўнога аддзялення.

На здымку — перадавыя мантажнікі Рыгор Ганчароў (злева), Уладзімір Шманаў, Мікалай Кролікаў, Леанід Варонін і Аляксандр Халецкі.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ. (БЕЛТА).

У ЖУРЫ ПА ЛІТАРАТУРНЫХ ПРЭМІЯХ ІМЯ Я. КУПАЛЫ І Я. КОЛАСА

Журы па літаратурных прэміях імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа паведамляе, што на атрыманне літаратурных прэмій 1965 года паступілі наступныя творы:

1. Д. Бічэль-Загнетава. Зборнік вершаў «Нёман ідзе».
2. А. Бажко. Паэма «Татры».
3. В. Вітка. Зборнік вершаў для дзяцей «Дударык».
4. А. Асіпенка. Аповесць «Абжыты кут».
5. А. Карпюк. Аповесць «Пушчанская адысея».
6. Р. Сабаленка. Трылогія «Іду ў жыццё».
7. І. Грамовіч. Зборнік апавяданняў «Сонца скрозь хмары».

Прадстаўлены Саюзам пісьменнікаў БССР.

8. П. Макаль. Зборнік вершаў «Круглы стол».
9. А. Русецкі. Паэма «Яго вялікасць».

Прадстаўлены Саюзам пісьменнікаў і рэдкалегіяй газеты «Літаратура і мастацтва».

10. А. Астрэйка. Зборнік вершаў «Слуцкі пояс».
11. А. Астрэйка. Паэма «Прыгоды дзеда Міхеда».

Прадстаўлены Уздзенскай гарадской бібліятэкай і групай былых партызан.

12. Я. Скрыган. Кніга «Свая аповесць».
13. М. Лужанін. Кніга «Колас расказвае пра сябе».

Прадстаўлены Саюзам пісьменнікаў БССР і рэдкалегіяй часопіса «Полымя».

14. І. Шамякін. Раман «Сэрца на далоні».

Прадстаўлены сходам чытачоў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна.

15. І. Новікаў. Дакументальная аповесць «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску».

Прадстаўлена рэдкалегіяй газеты «Літаратура і мастацтва».

Журы просіць да 1 снежня г. г. выказаць па ўказаных творах свае заўвагі ў друку або прыслаць па пошце.

Адрас журы: г. Мінск, Дом урада, Міністэрства культуры БССР.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА РАБОТНІКАЎ КІНЕМАТАГРАФІІ

У памяшканні кінастудыі «Беларусьфільм» адбыўся III пленум праўлення Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР. Ён абмеркаваў пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай нашых кінематаграфістаў да пяцідзесяцігоддзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і стагоддзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

Даклад аб задачах беларускіх кінаработнікаў у сувязі з набліжэннем вялікіх гістарычных дат зрабіў старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета міністраў БССР па кінематаграфіі Б. Паўлёнак.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. У іх прынялі ўдзел член рэдакцыйна-сцэнарнай калегіі студыі «Беларусьфільм» Н. Губарэвіч, галоўны рэдактар Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў С. Прошын, рэжысёры М. Фігуроўскі, П. Васілеўскі, В. Вінаградаў, аператары А. Булінскі, І. Пікман, Ю. Марухін, Г. Удавенкаў, рэжысёр Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў Р. Грыгор'еў, рэжысёр студыі «Масфільм» М. Швейцар, дырэктар карціны А. Жук, кінакрытык Е. Бондарава.

Падрабязная справаздача аб рабоце пленума будзе надрукавана ў наступным нумары газеты «Літаратура і мастацтва».

СЕМІНАР КІНАКРЫТЫКАЎ

Учора ў Мінску пачаў работу творчы семінар кінакрытыкаў, скліканы Саюзам журналістаў СССР.

На семінар сабраліся журналісты Украіны, Малдавіі, Літвы, Беларусі, Смаленскай, Калінінскай, Бранскай і Калінінградскай абласцей.

У праграму семінара ўваходзяць лекцыі аб новых тэндэнцыях сучаснага савецкага кінамастацтва, праблемах сусветнага кінамастацтва. Шырокая гаворка пойдзе аб асвятленні ў друку праблем кіно, творчасці кінакрытыкаў — удзельнікаў семінара. Журналісты прагледзяць і абмяркуюць новыя фільмы, сустрэнуцца з работнікамі студыі «Беларусьфільм».

У рабоце семінара прымаюць удзел рэдактар часопіса «Искусство кино» Л. Пагожава, кінакрытыкі Г. Капралаў («Правда»), Н. Лордкіпанідзе («Известия»), Ю. Ханюцін.

Семінар працягнецца да 2 лістапада.

Паэтычная ПАВЕРКА

Пімен ПАНЧАНКА

З АСЕННЯГА СШЫТКА

■ ■ ■

Мітынгі вялікай рэвалюцыі—
Боль адзін,
І стогн адзін,
І гнеў адзін.
Сходы для будзённай
рэзалюцыі—
Шум адзін,
І сум адзін,
І сон адзін.

Словы праўды,
Нас вы ратавалі
У часіны грозных небяспек.
Словы фальшу,
Вас па рытуалу
Мямліць раўнадушны чалавек.

А хацеў бы я збіраць натоўпы
Дружных, але стомленых
людзей
Толькі
Для вялікай справы,
Толькі
У тыя дні, калі набат гудзе.

■ ■ ■

На Палессі восень...
Гусі белыя
Выскублі мядовую траву.
І вятры, ад сцюжы ашалелыя,
То жвалотна свішчуць,
То равуць.

Смех і кветкі,
Вы куды падзеліся?
Навакол
Стагі, стагі, стагі.
Чым жа ты цяпер са мной
падзелішся,
Прыпяць, пачарнелая з тугі?

Ліст пажоўклы да плашча
прыколеш?
Ці на момант вернеш мне
ізноў
Каснічок зары,
Світальны колер
Тапалёў, буслоў і туманоў?

А сама замкнешся у лядоўні,
Лета у стагі паклаўшы спаць...
Будуць коні сніць лугі мядовыя
І, як людзі, цяжка уздыхаць.

ПАСЛЯ ВАНДРОВАК

Чаканне радасней здзяйснення:
І ў свята часам нудзімся,
Шуканні і перасяленні,
Мы ў вашым рытме круцімся...

Жыві, працуй,
А там, глядзіш,
Мясцком дасць атэстацыю —
І ты да караблёў ляціш,
Мінаючы ўсе станцыі.

Бадзяешся, цікавішся
І праўдаю, і казкамі...
Музеі ватыканскія,
Халупы афрыканскія.

Падзівішся на Нотр-Дам
І Луўрам ты насыцішся.
А лепш, калі з людзьмі і там
На добрым слове сыдзешся.

Адразу робіцца прасцей
Зямля з птушыным гоманам.
Пшаніца добрая расце
Пад Рымам, як пад Гомелем.

Сустрэнеш каля нільскіх вод
Бусла свайго палескага
І вернешся на цеплаход,
Усцешаны паездкаю...

Пабачыў: плаваюць кіты,
Сустрэўся з насарогамі.
А людзі ўсюды, як і ты,
З турботамі, трывогамі...

На моры гул і неспакой,
За хваляй хваля коціцца.
Убачыць родны бераг свой
Табе да болю хочацца...

Сысці на станцыі малой,
Дзе гай ды неба ціхае,
Дзе пахне сонцам і смалой
Ды птушаняты ціўкаюць;

Дзе глушыць колаў перастук
Палеміка сарочая,
Дзе мальвы свецяць
на вярсту
З лахматых агародчыкаў.

Чмялі над кветкамі басяць,
Гудуць над сапяжанкаю:
— Ну што, нагойсаўся, басяк,
Спаткаўся з парыжанкамі?..

Праўленне.
Тэлефон звініць,
Удакладняе графікі.
— Адкуль?
І хочацца зманіць
Ды буркнеш ціха:
— З Афрыкі...

Круглеюць вочы друга:
— Што ж,
А мне дык хоць бы выспацца...
Кароткатэрміновы дождж
На пыл дарожны сыплецца.

ПАХАВАННЕ

Здыміце шапкі:
Вязуць нябожчыка.
Мажліва, грузчыка,
Мажліва, возчыка.

Вязуць не нейкага,
Вязуць сумленнага:
Сябры—як непагадзь,
Жонка—самлелая.

А за нябожчыкам
Шыпенне шын.
Жалобным пошчакам
Гудкі машын.

На бруку слотным
Разгон гасі:
Не меней сотні
Таксі, таксі...

Прасілі людзі —
Ехаў праз ноч.
Таксісту ў грудзі
Ўсадзілі нож.

Таксісту выбілі
З вачніцаў сонца.
Бандыты выпілі
На тры чырвонцы...

А шофер, можа,
Калісь малых
Вёз асцярожна
З радзілкі іх.

Што ім, грамілам,
Наш добры век!
Памёр кармілец
І чалавек.

Няма запчастак
Для нас, мой друг...
Лісток зубчасты
Ляціць на брук.

БУДНІ МАСТАКОЎ

АБМЕРКАВАННЕ ВЫСТАВАК

У Мінскім салон-магазіне рэгулярна наладжваюцца выстаўкі—справаздачы маладых мастакоў. Кожная выстаўка абмяркоўваецца.

Цікавая гаворка нядаўна разгарнулася вакол работ Г. Паплаўскага, напісаных у час творчай камандзіроўкі ў Атлантыку і на Кубу. Большасць прамоўцаў станоўча паставілася да пошукаў мастака.

Неўзабаве адбудзецца абмеркаванне выстаўкі Л. Шчэмелева і М. Якавенкі.

І РАЗНАСТАЙНА, І ПРЫГОЖА

Выдавецтва «Беларусь» выпускае ў свет багата цікавых кніжак для дзяцей і юнацтва. Большасць з іх арыгінальна, з густам афармлена. У выдавецтве вядзецца штодзённая праца па выхаванню маладых мастакоў кнігі. На апошнім Усесаюзным конкурсе на лепшыя кнігі для дзяцей і юнацтва адзначаны дыпломамі кнігі маладых беларускіх мастакоў Алены Лось і Пятра Драчова.

І апошнія сігнальныя экземпляры дзіцячых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь», сведчаць пра творчы поспех маладых графікаў. Гэта кнігі В. Хомчанкі «Верны рыцар» (мастак — дыпламант Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута В. Шаранговіч), Я. Вількіна «Гісторыя Ліма Цудоўнага» (мастакі — выпускнік таго ж інстытута А. Зайцаў і Ю. Сандгазін), Г. Мушынскай-Гофман «Вера і яе таварышы» (мастак — выпускнік інстытута Г. Скамарохаў). Кнігі радуюць разнастайнасцю афармлення, упэўненым почыркам маладых майстроў.

Б. РАНІН.

СУСТРЭЧА З ПІЯНЕРВАЖАТЫМІ

Днямі ў Беларускім дзяржаўным мастацкім музеі адбылася сустрэча мастакоў з піянерважатымі сярэдніх школ рэспублікі. У ёй прынялі ўдзел Ул. Стальмашонак, С. Каткоў, П. Міско, Л. Шчэмелеў, Я. Кулік, Г. Паплаўскі, В. Ральцэвіч. Яны адказалі на шматлікія пытанні піянерважатых, далі ім карысныя сяброўскія парады.

КОРАТКА

НОВЫ партрэт Ул. І. Леніна стварыў у тэхніцы лінагравюры С. Герус.

АДБЫЛОСЯ пасяджэнне выстаўкома Саюза мастакоў БССР, на якім адабраны творы для накіравання на ўсесаюзную выстаўку «Мастацтва — дзецям», якая неўзабаве адкрыецца ў Маскве.

НАД АФАРМЛЕННЕМ славутай паэмы «Тарас на Парнасе» працуе Б. Забораў. Адначасова ён афармляе чатырохтомнік Максіма Танка.

ФЕСТЫВАЛЬ «РУСКАЯ ЗІМА»

Кацярына ФУРЦАВА,
міністр культуры СССР

З 25 снежня 1965 года па 5 студзеня 1966 года ў Маскве адбудзецца фестываль мастацтваў «Руская зіма». Па просьбе карэспандэнта АДН міністр культуры СССР К. А. Фурцава расказала пра гэты фестываль.

У нашай краіне ўжо стала добрай традыцыяй — штогадовае правядзенне вялікіх свят мастацкай творчасці— фестываляў мастацтваў. Яны даюць рэдкую магчымасць нашым суайчыннікам, а таксама зарубежным гасцям і турыстам за кароткі тэрмін азнаёміцца з лепшымі дасягненнямі савецкага мастацтва, з выдатнымі творамі, з творчасцю буйнейшых, прызнаных майстроў і таленавітай артыстычнай моладзі.

На рубяжы старога і новага года, калі зіма па-гаспадарску будзе распараджацца ў сталіцы, апранаючы яе ў беласнежнае іскрыстае ўбранне, у Маскве адбудзецца чарговы традыцыйны фестываль мастацтваў — «Руская зіма».

Сёлета паспяхова прайшлі ўжо тры падобныя фестывалі: веснавы — «Маскоўскія зоркі», летні — «Белыя ночы» ў Ленінградзе, асенні — «Мелодыі далін руж» у сталіцы Узбекістана Ташкенце.

Кожны з гэтых фестываляў меў свой непаўторны каларыт. А ўвогуле яны прадэманстравалі лепшыя дасягненні савецкага тэатральнага і музычнага мастацтва. Нашы і зарубежныя гледачы далі высокую ацэнку фестывальным праграмам.

Дык вось, 25 снежня адкрыецца чацвёрты па ліку фестываль мастацтваў — «Руская зіма». Думаю, што ён заслугоўвае таго, каб расказаць пра яго больш падрабязна. Гэты фестываль прысвячаецца галоўным чынам музыцы, песням і танцам народаў Савецкага Саюза.

Як і раней, фестывальная праграма прадугледжвае таксама выступленні лепшых мастацкіх калектываў, музыкантаў, вакалістаў, артыстаў эстрады і цырка.

Савецкае мастацтва — шматнацыянальнае. З песнямі і танцамі народаў нашай краіны гасцей фестывалю пазнаёмяць таленавітыя ансамблі, майстэрства якіх заваявала шырокую папулярнасць. Праўда, сёлета будзе прадстаўлена толькі частка нашых нацыянальных рэспублік. Але мы спадзяёмся, што ў час наступных фестываляў прадэманструюць сваё майстэрства дзеячы мастацтва і з іншых саюзных рэспублік нашай краіны.

З вялікім задавальненнем я называю калектывы, якія выступяць на фестывалі: Акадэмічны ансамбль народнага танца СССР пад кіраўніцтвам Ігара Маісеева, Чырванасцяжны імя А. Аляксандрава ансамбль песні і танца Савецкай Арміі пад кіраўніцтвам Барыса Аляксандрава, харэаграфічны ансамбль «Бярозка», якім кіруе Надзежда Надзеждзіна, Акадэмічны рускі хор СССР пад кіраўніцтвам Аляксандра Свешнікава і Рускі народны хор імя Пятніцкага, якім кіруе Валянцін Левашоў. У сталіцу з Кіева прыедзе ансамбль народнага танца Украінскай ССР пад кіраўніцтвам Паўла Вірскага. Сонечны Ташкент прышле ў Маскву ансамбль народнага танца Узбекістана «Бахор», якім кіруе Мікарама Тургунбаева.

Песеннае мастацтва народаў Закаўказзя будзе прадстаўляць харавая капэла Армянскай ССР (кіраўнік А. Чэкіджан).

І яшчэ адзін творчы калектыў, які палымяна прапагандуе рускую песню, мне хацелася б назваць. Гэта — Уральскі народны хор пад кіраўніцтвам В. Гарачых.

Кожны з названых мною калектываў выступіць з новай праграмай.

Гасцей фестывалю зноў чакаюць Вялікі тэатр СССР і Музычны тэатр імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі.

У сувязі з фестывалем мастацтваў «Руская зіма» яго гледачы і слухачы запрашаюцца не толькі ў тэатры і канцэртныя залы. Перад імі будуць шырока расчынены дзверы музеяў Маскоўскага Крамля, Траццякоўскай галерэі, Музея выяўленчых мастацтваў імя Пушкіна.

Будзе паказана некалькі вельмі цікавых, на наш погляд, выставак: выстаўка твораў мастакоў Савецкай Прыбалтыкі (у Манежы), выстаўка палотнаў нашага выдатнага жывапісца Сяргея Герасімава. Можам таксама назваць і Міжнародную выстаўку дзіцячага малюнка, якая адкрыецца ў гэтыя зімовыя дні ў Маскве.

Упершыню адбудзецца вялікі цыркавы паказ «Цырк на лёдзе». Ён абяцае быць вельмі вясёлы і цікавы. Сваё майстэрства зноў прадэманструюць майстры манежа, на гэты раз... ледзянога.

Як бачыце, праграма фестывалю «Руская зіма» — шырокая. Але, падкрэсліваю, галоўнае ў ёй — лепшыя творы мастацтва, паказ выдатных дасягненняў мастацкіх калектываў і салістаў.

Нам вядома, што фестывалі мастацтваў, у прыватнасці і «Руская зіма», выклікаюць вялікую цікавасць не толькі ў нашай краіне, але і за рубяжом.

«Інтурыстам» ужо атрымана некалькі тысяч заявак ад турыстычных фірм Францыі, Англіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Аўстрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Фінляндыі, Галандыі і іншых краін.

Мы гатовы аказаць гасцінасць усім тым, хто захоча прыехаць у Маскву на фестываль, будзем рады паказаць лепшыя дасягненні савецкага мастацтва замежным турыстам і гасцям. Бо мастацтва збліжае народы розных краін, садзейнічае паглыбленню ўзаемаразумення і дружбы паміж імі, што вельмі важна для высакароднай справы захавання і ўмацавання міру на ўсёй зямлі. Таму, звяртаючыся да сваіх суайчыннікаў, а таксама да зарубежных гасцей, мы гаворым: «Сардэчна запрашаем на фестываль мастацтваў «Руская зіма»!»

АДН.

Гэты здымак зроблены на Мінскім вакзале ў час сустрэчы работнікаў цыркавога мастацтва сацыялістычных краін прадстаўнікамі грамадскасці нашай сталіцы. На першым плане (злева) адзін са старэйшых артыстаў цырка Балгарыі, лаўрэат Дзімітраўскай прэміі Лазар Добрыч.

Фота Ул. КРУКА.

ЦЫРК СЯБРОЎ

Заўтра ў Мінскім дзяржаўным цырку адбудзецца прэм'ера новай праграмы «Цырк сяброў». Выканаўцамі вельмі разнастайных па жанрах нумароў выступяць таленавітыя прадстаўнікі братніх народаў Балгарыі, Венгрыі, Манголіі, Польшчы, Румыніі, Савецкага Саюза, Чэхаславакіі.

У праграме сяброў будзе цэлая серыя нумароў, якія адносяцца да жанру дрэсуры. Сярод іх — група дрэсіраваных драпежнікаў — ільвы і тыгры — пад кіраўніцтвам Эміля Самеша з Чэхаславакіі; камічны нумар «Сабакі-футбалісты» румынскага дрэсіроўшчыка Стана Аурыкэ і, нарэшце, выдатны нумар — дрэсіраваныя сланы (дрэсіроўшчык з Польшчы Станіслаў Баста). Апошні адрозніваецца ад іншых нумароў надзвычайнымі трукамі, цікавай кампазіцыяй і добрым тэмпам.

Мінчане ўбачаць на манежы рад маладых выканаўцаў. Групавыя танцы на дроце выканаюць маладыя венгерскія артысты Ліла.

Прадстаўнікі балгарскага цырка пакажуць унікальны і адзіны ў свеце нумар акрабатаўскакуноў на падкідных дошках. Унікальнасць гэтага нумара заключаецца ў тым, што яго выканаўцамі з'яўляюцца... дзяўчаты. Вопытны цыркавы педагог, народны артыст НРБ, лаўрэат Дзімітроўскай прэміі Лазар Добрыч пайшоў на гэтую рызыку, і яго спроба ўвянчалася поспехам.

Мінскія гледачы сустрэнуцца з папулярным балгарскім клоунам, заслужаным артыстам НРБ Тошка Казаравым і яго партнёрам Венціславам Паўлавым.

Савецкіх артыстаў Дзянісенкаў — выпускнікоў Дзяржаўнага цыркавога вучылішча — зменяць на арэне венгерскія жанглёры Цюндэ, мангольскія эквілібрысты Ягаанцэцік.

Наш цыркавы манеж стане арэнай вялікай братняй дружбы.

М. ЛУКАВЕЦКІ,
галоўны рэжысёр Мінскага дзяржаўнага цырка.

КІНО

ЖЫЦЦЁ АБАРАНЯЕ МАЦІ

Б'юцца аб бераг хвалі Лепельскага возера. І быццам з іх рытму сама сабой узнікае песня пра старую матчыну хату ў галубіным гарадку. Першыя ж кадры фільма «Балада пра маці» Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў адразу ствараюць атмасферу сонечнага цяпла, шчырасці, спакою. Гэта—паэтычны запеў да ўсяго твора. Вуліцы маленькага гарадка быццам трацяць сваю канкрэтнасць і становяцца сімвалам бацькоўскага дома, чалавечай ласкі, цеплыні. Квітнеючыя яблыні, старая жанчына з ветлівым, добрым тварам. Дыктар гаворыць: «Бацькам цалуюць рукі... Раллёй і сонцам, хлебам, малаком прапахлыя рукі... Пэўна, ад іх, нясгомных у працы і ласцы, гэтак светла і хораша на зямлі...»

Гэта твор не пра мірнае шчасце, не пра спакойнае, бясхмарнае жыццё. Аўтары расказваюць пра гераічны подзвіг жанчыны ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Зараз пра гэта мала хто ведае, бо яна, 80-гадовая бабуля—сціплая, ветлівая гаспадыня—не вельмі ахвотна ўспамінае пра трагічнае мінулае. Але нішто не павінна быць забыта! Народ павінен ведаць сваіх герояў. Таму пачэсную справу зрабілі аўтары фільма «Балада пра маці»—рэжысёр І. Вейняровіч, сцэнарыст А. Вялюгін,—расказаўшы аб простай беларускай жанчыне Варвары Архіпаўне Ардыновіч, якая ў часы вайны выратавала з фашысцкага палону некалькі дзесяткаў савецкіх ваеннапалонных; хавала ў сябе, апранала і карміла маленькіх дзяцей, асуджаных на смерць.

Найбольшае ўражанне робяць тыя месцы фільма, дзе мы бачым усхваляваны твар маці і чуем яе гаворку—усхваляваную, таропкую. Расказваючы пра мінулае, жанчына ў думках пераносіцца ў тыя жудасныя часы, калі ля самага яе дома білі, стралялі, вешалі людзей, калі кожны дзень прыносіў смерць. Маці зусім забываецца на кінаапарат, перад яе вачыма людзі, пра якіх яна ўспамінае. Часамі слёзы засланяюць ёй вочы і не даюць гаварыць. Слёзы і на вачах гледачоў. Аўтары тактоўна, умела зняли гэтыя сцэны і дасягнулі галоўнага: вобраз гераіні раскрываецца ва ўсёй сваёй велічы. У Варвары Архіпаўны няма эгацэнтрызму, яна не падкрэслівае свае заслугі. Расказвае не пра сябе, а пра людзей, іх пакуты.

Мова маці—жывая, усхваляваная, эмацыянальна насычаная. І стужка ў гэтых мясцінах дасягае сапраўднага публіцыстычнага напалу.

І быццам сама сабой гутарка маці пераходзіць у дыктарскі тэкст. Сцэнарыст А. Вялюгін умела падхопліваё эмацыянальны строй мовы. Ён паэтычна абагульняе расказанае Варварай Архіпаўнай.

Карціна прысвечана падзеям больш чым дваццацігадовай даўнасці, і аўтары не маглі зразумела, абмежаваўшы толькі паказам чалавека, які эмацыянальна «раскрываецца». Так, у гераіні фільма аказаўся вялікі эмацыянальны зарад, талент апавядальніка, мы ўбачылі яе вялікае сэрца, прастату, шчырасць. Але аўтары правільна вырашылі, што больш поўна перадаць атмасферу часоў акупацыі дапаможа мінулая хроніка. Яны ўдала падабралі дакументальныя кадры. Частка з іх—малавядомая польская хроніка, некаторыя кадры зняты самім аператарам-пастаноўшчыкам І. Вейняровічам у час вайны, ёсць і трафейныя кадры, знятыя фашыстамі. Хроніка ўдала спалучаецца з расказам нашага сучасніка. Глядач ведае: так яно і было, прыблізна тое ж бачыла і Ардыновіч, такія жахлівыя карціны расправы фашыстаў з мірнымі жыхарамі абуджалі нянавісць і волю да змагання.

І мне здаецца, што гэтае «прыблізна тое ж» у адносінах да ўзнаўлення фактаў мінулага і надае фільму сапраўдную мастацкую вартасць. Мы ў дадзеным выпадку не адчуваем фальшу. Аўтары не імкнуцца ўнушыць нам, што хранікальныя кадры ўзнаўляюць тое, пра што расказваецца, а даюць зразумець, што гэтыя кадры другія, сумежныя.

Аднак аўтары не заўсёды паслядоўныя і часам «зрываюцца» на фальшывыя ноты. Напрыклад, у фільме расказваецца пра ўцёкі палоннага, а ў гэты час бачым лес, зняты камерай, якая рухаецца рыўкамі. Гэта павінна сімвалізаваць тое, што бачыў чалавек у час уцёкаў. Але кадры гучаць наіўна. Гэтак жа неарганічна ўвайшлі ў фільм кадры пераправы цераз раку, якія суправаджаюць расказ маці пра тое, як яна пераправляла людзей у партызаны. Уключэнне гэтай хронікі мастацкі не апраўданае, стварае ўражанне падробкі, падрывае давер гледача да праўдзівасці карціны.

У фільме шмат удалых эпізодаў. Але крыўдна, што эпізоды часам застаюцца эпізодамі, асобнымі, не аб'яднанымі ў адзінае цэлае. Стужка магла б атрымацца значна лепшай і больш завершанай, калі б яе стваральнікі больш уважліва папрацавалі над кампазіцыяй, мантажным рытмам. У аўтараў быў багаты жыццёвы матэрыял, толькі яны не заўсёды найлепшым чынам яго выкарыстоўваюць. І ад гэтага кадры часам набываюць невыразную, аднастайную кампазіцыю. Мы бачым, як адзін чалавек расказвае, а слухачы, скаваныя прысутнасцю кінаапаратара, баяцца наварухнуцца, стаяць, нібы скамянелыя. Такое паўтараецца не раз на працягу фільма. Нам здаецца, рэжысёру трэба было больш эксперыментаваць, імкнуцца да разнастайнасці. Гэта дало б пэўны мастацкі эфект. Спробы такія ў стужцы ёсць. Маці, напрыклад, расказвае пра загінуўшую дзяўчынку, а на экране паказваецца помнік партызанам у Лепелі. І жанчына звяртаецца быццам да помніка. Гэта ўражвае больш, чым папярэднія кадры, у якіх мы бачым маці побач з яе слухачкай, скаванай перад кінаапаратам.

Вядома, можна здымаць расказ героя непасрэдна «ў кінаапарат». Але гэтым прыёмам, мне здаецца, нельга злоўжываць. Да таго ж, трэба асабліва пільна сачыць за тым, каб героі не адчувалі сябе «артыстамі», не пазіравалі. Калі, напрыклад, маці расказвае, як яе вялі расстрэльваць, ці Павел Фальковіч успамінае, як ён уцёк з-пад шыбеніцы,—яны не пазіруюць, яны забываюцца на кінаапарат. І гэта заслуга рэжысёра-аператара І. Вейняровіча. Але, калі ў некаторых іншых сцэнах мы бачым людзей, якія скавана вымаўляюць завучаныя напамяць тэксты,—гэта ўжо відавочны пралік стваральнікаў фільма.

Галоўны ж недахоп гэтай увогуле цікавай, месцамі хвалюючай карціны, мне здаецца, у тым, што ў ёй няма выразнага лагічнага стрыжня. Асобныя эпізоды часам амаль не звязаны. Калі не лічыць паэтычна зробленых пралога і эпілога, у фільме не адчуваецца «баладнасці»—жанравай адметнасці стужкі.

Многія сцэны часам проста няўдалыя. Так, напрыклад, няўдала зроблены пераход ад пралога да кадраў, якія апавядаюць пра сасну-шыбеніцу. Аўтары ўводзяць інсцэніраваны эпізод: у садзе пажылая жанчына падыходзіць да свайго ўнука, а той якраз чытае верш М. Танка «Сасна». Потым паказваецца сама сасна. Гэта «гучыць» ненатуральна...

Агульнае ўражанне ад карціны «Балада пра маці»—няроўнае. Ад здольнага здымачнага калектыву мы маем права чакаць не толькі асобныя ўдалыя сцэны, але і цэлы фільм, зроблены на адным дыханні.

В. НЯЧАЙ.

У памяшканні Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў у сувязі з 50-годдзем заснаванага дзеяча мастацтваў БССР Канстанціна Кандратавіча Казелкі адкрыта яго персанальная выстаўка. Работы народнага ўмельца далёка вядомы за межамі рэспублікі. Ён паставіны ўдзельнік абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставак народнай творчасці.

Сваё майстэрства К. Казелка перадае дзецям. У Давыд-Гарадку, у Доме піянеру пад яго кіраўніцтвам дзеці вучацца маляваць, ляпіць з пластыліну, выразаць фігуры з дрэва.

На здымку — К. Казелка сярод наведвальнікаў выстаўкі ў Палацы культуры прафсаюзаў.

Фота Ул. КРУКА.

ЭСТЭТЫКА ЎКАРАНІЛАСЯ НА ЗАВОДЗЕ

Нядаўна мне давялося размаўляць з адным маладым рабочым Лідскага галаўнога завода аб'яднання «Электратэхніка». Юнак скончыў дзесяцігодку, адслужыў у радах Савецкай Арміі, зараз займаецца завочна ў тэхнікуме. Я спытаў у гэтага хлопца, што ён разумее пад тэрмінам—прамысловая эстэтыка. Ён адказаў мне вельмі проста і ў той жа час, на маю думку, правільна:

— Гэта, калі цэх радуе вока... І добра, што на нашым заводзе зараз тэхнічнай эстэтыкай пачалі займацца сур'ёзна.

Малады рабочы сказаў праўду. Новыя цэхі лідскага завода «Электратэхніка» ўтульныя, чыстыя. Праз шырокія вокны ў іх льецца сонечнае святло, радуе вока светлая афарбоўка сцен, канвеерных стужак і паточных ліній. Ля вокан—кветкі... Увечары і ноччу цэхі асвятляюцца люмінесцэнтнымі лямпамі.

На прадпрыемстве створана грамадская камісія па эстэтыцы, якую ўзначальвае старшы інжынер-канструктар Барыс Мікалаевіч Папцоў. У яе ўваходзяць інжынеры, тэхнікі, рацыяналізатары, рабочыя. Яны кожны тыдзень правяраюць стан культуры вытворчасці, пашыраюць эстэтыку на заводзе.

Ну, а як жа з мастацкім афармленнем саміх вырабаў прадпрыемства? Лідскі ж завод выпускае рэчы, якія знаходзяць непасрэдны ўжытак у быце людзей, напрыклад, электрычныя люстры, падвесы, прасы... І тут лідчане маюць значны поспех. Дастаткова сказаць, што ўсе вырабы галаўнога завода аб'яднання «Электратэхніка» адобраны Вышэйшым мастацкім саветам Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута прамысловай эстэтыкі. Барыс Мікалаевіч называе гэтыя вырабы спецыфічна: люстры Л-21 і Л-36, падвесы ПШ-12, люмінесцэнтныя свяцільнікі СВ-1, СП-1, электрычныя прасы з тармарэгулятарамі і электраплітці са стрыжневым нагрэвам... Няхай у прыведзеных назвах і няма «эстэтыкі» гучання, але гэта сучасныя прыгожыя вырабы з палімераў і іншых матэрыялаў. Яны адпавядаюць лепшым сусветным стандартам і ўзорам.

І нарэшце, як жа ўплывае ўкараненне тэхнічнай эстэтыкі на працу рабочых? Вось што гаворыць дырэктар завода Раман Канстанцінавіч Федасеенка:

— За сямігодку прадукцыйнасць працы на заводзе ўзрасла ў 2,8 раза, заробак рабочых павялічыўся на 127 працэнтаў. Гэтаму ў многім пасадзейнічала і пастаянное ўкараненне тэхнічнай эстэтыкі.

С. ДУБРОВА.

ЗНАЁМСТВА З НАВІНКАМІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Чым бліжэй да пленума праўлення беларускай кампазітарскай арганізацыі (ён адбудзецца ў снежні сёлетняга года), тым усё больш новых твораў самых розных жанраў можна пачуць у зале саюза на музычных «серадах». Калегі па працы ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца тут з такімі навінкамі беларускай музыкі, як фартэпіянны цыкл Л. Абеліёвіча «Фрэскі», струнны квартэт А. Янчанні, Трэці струнны квартэт Д. Лунаса і іншыя.

Мінулая музычная «серада» была прысвечана паказу і абмеркаванню Другой санаты М. Аладава для дзвюх скрыпак, віяланчэлі і фартэпіяна, песні-раманса таго ж аўтара «Водпаведзь» на словы Н. Гілевіча і вакальных твораў А. Янчанні.

Саната М. Аладава—вельмі арыгінальны па выкарыстанні інструментаў твор у чатырох частках—зрабіла вялікае ўражанне сваім яркім меладызмам, глыбокай эмацыянальнасцю і вобразнасцю. Гэты новы твор старэйшага кампазітара ўдала быў выкананы Л. Гарэлікам, А. Дабжынцом (скрыпка), Л. Рубанчыкам (віяланчэль), С. Талкачовым (фартэпіяна).

А. Янчанка цяпер піша вялікі вакальны цыкл на словы сучасных замежных паэтаў, які будзе складацца з трохчатырох частак (у ножную ўвойдуць пяць песень). На мінулай «серадзе» малады кампазітар паказаў у магнітафонным запісе першую частку вакальнага цыкла (саліст Маскоўскай філармоніі М. Рыба). Яна складаецца з лірычных песень: «Калі б...» (словы югаслаўскага паэта В. Папо), «Шчодрыя вочы», «Парыж ноччу», «Для цябе, каханая» і «Лёгкая мелодыя» (тэксты французскіх паэтаў П. Элюара і Ж. Прэвера).

У абмеркаванні новых твораў прынялі ўдзел В. Сізко, А. Ракава, Л. Доўнар, С. Талкачоў, Л. Бергер, С. Картэс, Д. Лукас, Т. Дубкова, М. Шнейдэрман, Д. Камінскі, Г. Вагнер.

Нашы інтэрв'ю

ПОДЗВІГІ БАЙЦОЎ НЯЎМІРУЧЫЯ

Калі мы прыйшлі ўзяць гэтае інтэрв'ю ў старшыні Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў вайны генерал-лейтэнанта Ніла Рыгоравіча Вядзенічава, у прыёмную да яго адзін за адным ішлі наведвальнікі. Ніл Рыгоравіч на пытанні нашага карэспандэнта аб задачах савета ветэранаў адказаў:

— Вельмі добра, што газета «Літаратура і мастацтва» пазнаёміць сваіх чытачоў з работай нашага савета, з тымі задачамі, якія ён вырашае. Што датычыцца задач савета, — працягваў ён, — то пасля паведамлення БЕЛТА аб стварэнні Рэспубліканскага савета ветэранаў вайны многія сталі звяртацца да нас, каб мы вырашалі пытанні, звязаныя з прызначэннем пенсій, атрыманнем кватэр, пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і г. д.

Вядома, наш савет не можа вырашаць такіх пытанняў. Яго асноўныя задачы — гэта прапаганда слаўных баявых традыцый савецкага народа, правядзенне выхаваўчай работы сярод ветэранаў вайны, насельніцтва і асабліва моладзі ў духу савецкага патрыятызму, умацавання міру, дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі. Пошукі яшчэ невядомых герояў вайны — подзвігі іх павінны стаць здабыткам усяго нашага народа. Садзейнічанне ўвекавечанню памяці савецкіх воінаў і партызан, што загінулі ў баях грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, увекавечанне памяці савецкіх людзей, якія закатаваны ў гітлераўскіх канцлагерах.

Потым Ніл Рыгоравіч па просьбе нашага карэспандэнта расказвае пра арганізацыйную будову Рэспубліканскага савета ветэранаў вайны і яго планах работы на бліжэйшы час.

— Спачатку, напэўна, трэба сказаць, што іменна абумовіла стварэнне ў нашай рэспубліцы такой арганізацыі. За апошнія гады ў многіх гарадах і раёнах паявіліся саветы, секцыі ветэранаў вайны, адкрыліся клубы, музеі, куткі баявой і працоўнай славы. Краязнаўчыя гурткі, таварыствы збіраюць цікавыя матэрыялы аб баявым мінулым свайго раёна, вобласці.

Сёння ў рэспубліцы налічваецца 89 клубаў «Баявой славы». 2 500 куткоў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы адкрыта ў школах і іншых навучальных установах. А колькі іх у дамах культуры калгасаў, саўгасаў і прадпрыемстваў! Мясцовыя арганізацыі ветэранаў праводзяць вялікую работу: наладжваюць сустрэчы працоўных з ветэранамі рэвалюцыйнага руху, удзельнікамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, адкрываюць музеі, прысвечаныя гераізму і мужнасці нашага народа, ушаноўваюць памяць загінуўшых савецкіх воінаў, увекавечваюць месцы былых баёў.

З мэтай каардынацыі гэтай работы, каб яна стала яшчэ больш змястоўнай і мэтанакіраванай, адзначае далей генерал-лейтэнант, і быў створаны Беларускі рэспубліканскі савет ветэранаў вайны. Савет выбраны на рэспубліканскім сходзе прадстаўнікоў ветэранаў у складзе 59 чалавек. Сярод іх — 25 Герояў Савецкага Саюза, а таксама прадстаўнікі ветэранаў з абласцей Беларусі. У саставе створаны тры секцыі: былых франтавікоў, партызан і вязняў фашысцкіх канцлагераў.

Наш савет створаны ўсяго тры месяцы назад. Галоўнае ў арганізацыйнай рабоце зараз — устанавіць трывалую сувязь з усімі мясцовымі арганізацыямі, наладзіць узаемную інфармацыю аб рабоце, што праводзіцца, і з улікам вопыту, які мы ўжо маем, шукаць найбольш прыдатную форму работы нізавых арганізацый ветэранаў, якія маглі б з поспехам памагаць музеям, культурна-асветным установам, дамам афіцэраў, членам краязнаўчых гурткоў, юным гісторыкам школ шырока прапагандаваць слаўныя старонкі гісторыі нашай Радзімы, гераічныя справы яе мужных абаронцаў.

— Побач з гэтай арганізацыйнай работай, — працягвае расказ Ніл Рыгоравіч, — савет ветэранаў вайны і яго актыў вядзе вялікую прапагандысцкую работу, выступаючы з лекцыямі на патрыятычныя тэмы, з успамінамі пра баявое мінулае, удзельнічаючы ў арганізацыі ўрачыстых вечароў—провадаў прызыўнікоў на службу ў Савецкую Армію, шматлікіх тэматычных вечароў, сустрэч салдат, рабочых, калгаснікаў, служачых, студэнтаў і школьнікаў з былымі воінамі і ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Мы збіраемся абагуліць вопыт работы лепшых «Клубаў баявой славы» і на гэтай аснове даць нашым актывістам метадычныя парады, як лепш правесці тое ці іншае мерапрыемства.

Па ўсесаюзным тэлебачанні ў перадачах тэлеальманаха «Подзвіг» часам выступаюць ветэраны грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, якія жывуць у нас у Беларусі і праводзяць вялікую работу па патрыятычнаму выхаванню насельніцтва. Гэтыя перадачы выклікалі вялікую цікавасць у тэлегледачоў. Мне думаецца, было б карысна, калі б і наша Беларускае тэлебачанне разам з саветам ветэранаў, ЦК камсамола Беларусі, Саюзам пісьменнікаў арганізавалі падобны рэспубліканскі тэлеальманах, прыкладна, пад такой назвай — «Ветэраны, час, моладзь».

— Сярод падпісчыкаў газеты «Літаратура і мастацтва»,—гаворыць далей генерал-лейтэнант Н. Вядзенічаў, — ёсць нямала ветэранаў вайны, актывістаў. Я маю на ўвазе работнікаў культасветустаноў і настаўнікаў, якія памагаюць юным гісторыкам. Яны вядуць летапісы сваіх вёсак, запісваюць успаміны ветэранаў вайны, адкрываючы невядомых яшчэ народу герояў, якія здзейснілі подзвігі, знаходзяць новыя дакументы, рэліквіі баявой славы, часам нават унікальныя каштоўнасці. На жаль, бываюць выпадкі, калі, не ўяўляючы сапраўднай значнасці знойдзенага дакумента, рэліквіі, людзі з-за неахайных адносін губляюць іх, псуюць. Хацелася, каб пра кожную такую знаходку неадкладна паведамлялася ў Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай айчыннай вайны, з якім савет ветэранаў працуе ў цесным кантакце.

І яшчэ адна заўвага. Сярод удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў знойдзецца нямала людзей з цікавай баявой біяграфіяй. Ім ёсць што расказаць маладым. Аднак, далёка не кожны ветэран вайны можа сам падрыхтаваць да друку свае ўспаміны. Вось чаму хочацца звярнуцца да беларускіх пісьменнікаў і журналістаў з просьбай памагчы вядомым франтавікам і партызанам напісаць новыя дакументальныя кнігі пра абаронцаў нашай Радзімы.

— У заключэнне, — сказаў генерал-лейтэнант Н. Вядзенічаў, — хочацца ад імя Рэспубліканскага савета ветэранаў вайны праз газету «Літаратура і мастацтва» пажадаць усім работнікам культурна-асветных устаноў, творчым саюзам рэспублікі новых поспехаў у прапагандзе баявых і працоўных подзвігаў савецкага народа.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

У МАРМУРЫ, БРОНЗЕ, ГРАНІЦЕ...

АНДРЭЮ БЕМБЕЛЮ — 60 ГОД

Калі Б Андрэй Бембель быў аўтарам толькі адной работы—партрэта Мікалая Гастэлы, дык і гэтага было б дастаткова, каб імя яго трывала ўвайшло ў гісторыю савецкай скульптуры. А спіс яго асноўных твораў перавышае сотню. Ён стварыў вобразы Уладзіміра Ільіча Леніна, Карла Лібкнехта, Аляксандра Матросава, Д. Мендзялеева, Адама Міцкевіча... У яго творчасці ажываюць падзеі і характары людзей часоў Парыжскай камуны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, даваенных пяцігодак і грозных год Вялікай Айчыннай, слаўная наша сучаснасць. Ён цудоўны майстар рэльефу, партрэта, майстар кампазіцыі. Яго талент—глыбока народны, грамадзянскі. Андрэй Бембель трымаецца ў творчасці актыўнай савярджальнай пазіцыі. Ён заўсёды верны праўдзе жыцця, рэалістычнаму творчаму метаду.

Творы Андрэя Бембеля з'яўляюцца на рэспубліканскіх і ўсесаюзных мастацкіх выстаўках вось ужо больш трох дзесяткаў год. Лепшыя з іх перадаюць гераічны дух нашай эпохі, сведчаць пра пільную ўвагу майстра да ўнутранага свету савецкага чалавека. Гэта работы паэтычныя, поўныя манументальнай сілы.

Ужо самыя першыя творчыя крокі скульптара засведчылі шырыню яго эстэтычнага дыяпазону. Гэта былі творы, прысвечаныя Кастрычніку і Уладзіміру Ільічу Леніну.

Перад гэтым Бембель прайшоў сур'ёзную творчую школу. У родным горадзе Веліжы яго настаўнікамі былі М. Эндэ, М. Керзін, В. Волкаў. Пасля яны ж вучылі яго ў Віцебску.

У канцы дваццатых гадоў Андрэй Бембель едзе ў Ленінград—у Акадэмію мастацтваў. Там яго настаўнікамі сталі М. Манізер, В. Лішаў, Мацвей Генрыхавіч Манізер імкнуўся развіваць у юнаку ўласнае бачанне свету, уласнае адчуванне формы. Васіль Львовіч Лішаў — тонкі знаўца класічнай спадчыны—асабліва шмат даў Бембелю ў разуменні спецыфікі рэльефу. У пачатку ж трыццатых гадоў, калі Бембель вярнуўся на Беларусь, яму пашчасціла працаваць плячо ў плячо са сваім ленінградскім настаўнікам Мацвеем Генрыхавічам Манізерам пры скульптурным афармленні Дома ўрада ў Мінску. Пашыраць эстэтычны дыяпазон, тонка ўспрымаць класіку спрыяў маладому Бембелю Міхаіл Аркадзьевіч Керзін, які некалі падтрымаў першыя крокі будучага скульптара ў лепшы. Страсць Керзіна да мастацтва перадавалася вучням надзвычайна актыўна. І не толькі страсць, але і высокая творчая культура.

З маладосці Бембель працаваў у цікавым творчым асяроддзі сваіх таварышаў — беларускіх скульптараў. У Віцебску ў Керзіна разам з ім вучыліся А. Глебаў, З. Азгур, А. Арлоў. З ім разам працавалі да вайны ў Мінску Г. Ізмайлаў, сябры па гадах вучобы ў Ленінградзе Ул. Рытэр і Вольга Дзядок.

Сёння атрад беларускіх скульптараў моцна вырас — і працаваць стала яшчэ цікавей. Творчасць калег спрыяе роздуму, пошукам, творчым спрэчкам.

Бембелю як мастаку ўласцівы выключная працаздольнасць, настойлівасць, рашучасць, смеласць у творчых пошуках, тонкае разуменне скульптурнай формы, якую ён будуе лаканічна, выразна.

Гэта могуць пацвердзіць многія яго работы: змястоўныя рэльефы для Дома ўрада ў Мінску, напружаныя па дзеянню, выразныя па сувязі паміж іх персанажамі, дынамічныя работы 1939—1941 гадоў для павільёна БССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, партрэт Мікалая Гастэлы, створаны ў гады Вялікай Айчыннай, статуя «Слава гераічнай працы калгаснага сялянства!», якая вянчае беларускі павільён на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, статуя Д. Мендзялеева перад будынкам хімічнага факультэта Маскоўскага універсітэта імя М. В. Ламаносава, бюст артыста П. Малчанава, партрэт доктара С. Ліранцэвіча.

Бембель — скульптар-манументаліст. Але не цураецца ён і камернай тэмы. І ва ўсіх работах ён у той або іншай ступені лірык.

Задушэўнасць, чалавечнасць... Яна ў тым, што, акцэнтуючы, напрыклад, волю, энергію, мэтаімкнёнасць сваіх персанажаў, скульптар шчасліва пазбягае «тыпажнай» аднастайнасці. За важнымі для тыпізацыі вобраза акцэнтамі скульптар не забывае пра індывідуальнае аблічча, характар, лёс чалавека. Ён падыходзіць да чалавека ўважліва, імкнучыся да разумення ўнутранай сутнасці характару. Сінтэзуючы, не забывае індывідуалізаваць. «Не забывае» — кажу тут умоўна, бо гэтае «не забывае» ў Бембеля арганічнае яго таленту, яго творчым прынцыпам.

І яшчэ важна падкрэсліць, што тыпізаваны сінтэтычны вобраз у яго заўсёды ў аснове сваёй ідэйна-змястоўны і грамадска значны. Манументалізацыя ў яго не знешняя, а арганічна злітая з ідэйна-вобразнай задачай. Высакароднае прызначэнне чалавека на зямлі, веліч яго спраў—сцвярджэнне гэтага і робіць яго вобразы манументальнымі. Што ж датычыць саміх маштабаў, лаканізму формы, канструктыўнасці кампазіцыі, выбару матэрыялу і спосабу яго апрацоўкі—дык усё гэта падпарадкавана выяўленню сэнсу вобраза, яго зместу.

Сапраўднае адкрыццё зроблена Андрэем Бембелем у галіне «кампазіцыйнага партрэта». Гэта яго «Мікалай Гастэла». Скульптару ў гэтай рабоце ў найбольшай меры ўдалося практычна рэалізаваць сваё тэарэтычнае перакананне ў тым, што на сучасны партрэт трэба паглядзець неяк інакш, не адмаўляючы традыцыйных рашэнняў, але ўсведамляючы, што сучаснасць патрабуе новага падыходу да героя.

Гэтая наватарская ўдача пераканальна прааналіавана шматлікімі мастацтвазнаўцамі краіны. Партрэт Мікалая Гастэлы настолькі ж шырока вядомы, як і шматлікія класічныя ўзоры савецкай скульптуры.

Імкненне да вялікіх абагульненняў, роздум над жыццём, роздум, трывала звязаны з надзённымі задачамі нашага грамадства,—і ў такіх работах Андрэя Бембеля нядаўніх год, як барэльеф «Беларуска», алегарычная статуя «Няхай ніколі не будзе ўзяты меч!», рэльефы для новага будынка Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна, для залы з'езду Дома ўрада вялікі бюст Мяснікова, партрэт Героя Савецкага Саюза Гуляева і вечна хвалюючы вобраз Уладзіміра Ільіча, да якога скульптар звяртаецца на працягу свайго творчага шляху неаднаразова.

Вобраз Мяснікова, як і кожны іншы, скульптар спрабуе вырашаць паразнаму—то больш эпічна, то больш лірычна.

Вось Мяснікоў у ваеннай фуражцы. Суровы, валявы твар. Пагляд скіраваны ўдалеч... А вось Мяснікоў з адкрытай галавой, на мітынгу, выступае перад народам. Натуральны жэст прамоўцы, перакананага ў правіце сваіх думак, чалавека простага, неадрыўнага ад рэвалюцыйнай масы. Ён—плоць ад плоці, кроў ад крыві гэтае масы... Тут ён мяккі, лірычны, задушэўны пры ўсёй сваёй суровасці.

Народны мастак БССР Андрэй Ануфрыевіч Бембель — цудоўны скульптар, актыўны грамадскі дзеяч, умелы педагог. Вынікі яго педагагічнай працы мы сёння бачым на свае вочы. Дастаткова прыгадаць імёны такіх добрых і розных выхаванцаў Андрэя Ануфрыевіча, як скульптары Анікейчык і Мурамцаў, Дзям'янаў і Маркаў, Лятун і Гумілеўскі, Санько і Хмызнікаў, Бельскі і Арцімовіч...

Мне прыгадваюцца першыя крокі ў бембелеўскай майстэрні Генадзя Мурамцава. Недахопы работы вучня Бембель бачыў адразу, але імкнуўся, каб вучань сам знайшоў іх. Ён быццам падказваў толькі, дзе шукаць гэтыя недахопы, рэдка беручы з рук вучня стэку...

Ён заўсёды дае сваім вучням максімум самастойнасці ў пошуках—мабыць гэта і вабіць моладзь да Бембеля.

Сам шмат працуючы, багата часу аддаючы сваім выхаванцам, прымаючы актыўны ўдзел у рабоце Саюза мастакоў як член яго праўлення, Андрэй Ануфрыевіч не прамінае і выставак твораў маладых жывапісцаў і абмеркаванняў іх, і абмеркаванняў разам з архітэктарамі і журналістамі шляхоў паляпшэння аблічча Мінска. І кожнай справе аддаецца ён з усім запалам свайго сэрца.

Бембелю спаўняецца шэсцьдзесят. Ён—у самым росквіце таленту. Задачы, якія скульптар ставіць сабе,—найлепшае таму сведчанне. Ён задумаў партрэт Рыхарда Зорге, не пакідае працы над помнікам абаронцам Брэсцкай цытадэлі. Да слаўнага 50-годдзя Вялікага Кастрычніка распрацоўвае шматфігурную кампазіцыю «Камуністы».

...Вось ён стаіць у сваёй майстэрні, кранаючы далонню камень. І — мармур чакае...

У такія мінуты, пэўна, і нараджаюцца новыя задумы мастака...

Кожная яго работа—гэта занатаваныя ў бронзе ці гіпсе, у мармуры ці граніце жывыя і самастойныя пошукі праўды аб жыцці. Гэта любоў і нянавісць мастака, яго радасць і боль, яго гнеў і яго пяшчотнасць. Гэта глыбокая, змястоўная размова, якая вядзецца з сучаснікам пра самае запаветнае ў чалавеку.

Уладзімір БОЙКА.

У Мінску па Ленінскім праспекце адкрыўся спецыялізаваны магазін сельскагаспадарчай кнігі. У ім вялікі выбар літаратуры. А жыхары раёнаў могуць заказаць кнігу тут па пошце.

На здымку — работнік магазіна Маргарыта Міналаёўна Вароніна дапамагае пакупнікам выбраць патрэбную кнігу.

Фота М. ШМЕРЛІНГА.

Сяброў кніг

УЗЫХОДЖАННЕ

Светлана ЕВСЕЕВА

НОВОЛУНЬЕ

«Беларусь» 1965

Паэзія — таксама вера. І ў яе, у паэзіі, ёсць свой бог, сваё бажаство. Не ў рэлігійным, вядома, сэнсе, а ў тым, у якім вялікі атэіст Пушкін паставіў гэтае слова побач са словам натхненне — «и божество, и вдохновенье». І ў яе, у паэзіі, ёсць свае мінуты экстазу, свае малітвы.

К планете припадаю на закате,
Затылком — к переменчивой звезде.
В беде я землю умоляю:— Мати!
О, помоги мне быть на высоте.

Гэта малітва, звернутая да зямлі. А вось — да неба:

Как про себя немая,
Как про себя нагая,
Я про себя точно
Знаю, кто я такая.
Небо мое, здравствуй!
Кто я? Звезда...

Для лірычнай гераіні Святланы Яўсеевай — гутарка ідзе пра яе новы зборнік «Новолунье» — вельмі характэрная такая вось глыбокая ўзрушанасць, такое вось трывожна-ўсхваляванае пытанне: «Хто я?» Пытанне, якое не дазваляе ёй ні на мінуту супакоіцца, а тым больш саміздаволіцца, душэўна ачарсцвець. Маральны ідэал яе высокі і светлы. І ў той жа час па-зямному канкрэтны, акрэслены. «По-человечески, по-женски» (словы паэтэсы) яна не «хочет повестки. Вдруг опять?!» А ў другім вершы («Браканьеры») запальчыва-злосна кідае: «Я знаю: не было б войны, когда б не браконьеры!» І калі б яшчэ не «злодзеі», якія «тоже любят Блока. И Льва Толстого. Черт возьми!» (Верш «В библиотеке»). «По-человечески, по-женски»—і па-цвятаеўску, дадам яшчэ,—яна не можа цярпець «мебельного честолюбья», «скудного, остандарченного уюта». Яна не прызнае сонную, пляжную прыгажосць, якая «бывает непотребной, если нет движенья у нее». Яе абураюць пыхлівасць, заізд расць, дробязнасць і іншыя нізкія інстынкты і заганы, якія жывуць яшчэ ў чалавеку і прыніжаюць яго. Менавіта супраць іх і скіраваны крытычна-выкрывальны пафас паэмы «Большая Медведица», асобныя раздзелы якой так і называюцца: «Вещечеловеки», «О зависти», «О тщеславии», «О собственности», «О предателе». І рэчы ў паэме называюцца сваімі імёнамі, называюцца рашуча, прама, на ўвесь голас, з той катэгарычнасцю, якая, калі мець на ўвазе не пафас, а форму, паварочваецца нават дзе-нідзе публіцыстычнымі пераборамі.

Адчужаным паміж сабой «рэчачалавекам» аўтар паэмы супрацьпастаўляе інтэрнат, аб'яднанне людзей, дзе ўсе, як зоры ў сузор'і Вялікая Мядзведзіца, — адсюль і назва паэмы, — роўныя, дружныя, аднолькава светлыя, «и нет звезды основной».

Запаветны ідэал паэтэсы — чысціня. Не тая, якую нараджае пыхлівасць, не тая, што напаказ, за якую дае прэмію ў студэнцкім інтэрнаце «неизбежный сансовет», а сапраўдная, натуральная, унутрана ўласцівая. Чысціня маральная. І паэтэса вядзе нас у свет, дзе няма ніякага бруду, які «сжигает живое, как лава», а ёсць «пречистый город» (С. Яўсеева любіць гэты трохі архаічны эпітэт—«пречистый», гэтак жа як і звычайны — чысты). Ёсць сад, дзе садоўнічаў яе бацька, і дзе «дупла закрашены, кроны чисты, в извести крепкие спины. Яблони, словно богини статны...» Ёсць чыстыя матчыны рукі — «два луча, пропахшие укропом». Ёсць чыстыя, «как воды Немана пречисты», губы каханага. Губы, якіх не бывае ў кар'ерыстаў, у хабарнікаў, «растратчиков казенных денег», губы, якія неабходны «не только мне—моей стране». Лепшыя вершы зборніка і прадыктаваны гарачай верай у чалавечую чысціню і прыгажосць.

Пра сябе, пра сваю ўпартую, невынішчальную волю да чысціні, да ідэалу паэтэса сказала ў паэме так:

Что я вырубить желала,—
Вырубила. Вполне!
Что горенью подлежало,—
Выгорело во мне.

Велаеш, прачытаўшы новую кнігу паэтэсы, што паэзія для яе — не проста словатворчасць, а справа яе сумлення і яе душы, яе боль і роздум, і не можаш не верыць гэтым словам аб самаачышчэнні. І не можаш быць абыякавым да іх, спачуваеш іх аўтару — не проста ж вось так самаахвярна жыць і працаваць. (У другім месцы паэтэса так напісала пра сваю работу: «Наш труд — уже до гробовой доски»). І даруеш, хочаш даравать ёй і менш удалыя вершы, і ўсё тое, што не задавальняе ў зборніку. А асобныя пралікі яго нельга не заўважыць.

Ёсць у паэзіі закон, заўважаны Блокам: чым цяжэйшае нараджэнне гуку, тым больш ясную форму імкнецца ён набыць. «Гук» у С. Яўсеевай, асабліва ў яе лірычных вершах, як правіла, глыбінны, ідзе з самага сэрца, нараджаецца ў муках. І ён, натуральна, шукае найбольш выразнага выяўлення, найбольш яснай матэрыяльна-вобразнай абалонкі. І часта знаходзіць. Але ў некаторых выпадках адчуваеш толькі яшчэ самі гэтыя пошукі, толькі само імкненне да яснасці, але канчатковага выніку гэтага імкнення няма. Асноўная думка верша «И спять я начинаю рейс» выказана ў двух апошніх радках:

Я бы вымерла, да не умру,
Слишком много рек в меня впадает!

Сказана добра. Свежа і вобразна. Але ці да гэтага, менавіта, вобраза імкнуўся ў дадзеным выпадку «гук»? Сумняваешся таму, што паэтэса прыпадабняе сябе на працягу верша і поўнаму трамваю, які вось-вось з'едзе з рэек, і спалоханаму гарнастаю, і сіраце. Комплекс асацыяцый, як снежны камяк расце, у вершы з'яўляюцца яшчэ і «дуплистые дубы», і «низкие стрелы». Словам, што ні страфа—то свая метафара, свой вобраз. І ў выніку верш пазбаўляецца адзінства вобраза. Змест яго даходзіць, можна зразумець паэтэсу, яе хваляванне, яе думку (яна не растлумачыла ў апошніх радках), але яснасці, завершанасці формы, да якой імкнуўся трудны «гук», няма.

Трапляюцца ў кнізе — па той жа, відаць, усё прычыне, а, магчыма, і з-за жадання аўтара быць моднай,—вобразы крыху штучныя, надуманыя. Напрыклад—моль у аднайменным вершы. Моль тут яўна не вытрымлівае той сэнсавай нагрузкі, якую на яе ўскладаюць, не «цягне» ў якасці ворага прагрэсу. Так жа, як не можа быць сур'ёзным увасабленнем прагрэсу і сучасны гардэроб («висит прогресс — капроновый, стеклянный...»).

Дакараеш часам паэтэсу, чытаючы яе новыя вершы, і за свядомую яўна схільнасць да залішняй, неапраўданай метафарычнасці і вычварнасці. Асабліва, калі апошнія паварочваюцца перламі, накшталт: «И теперь мои ресницы— со слезами не на ты». Або: «Вам кравилось радовать нас, пробивать будни гвоздиками своих улыбок». Або (пра зялёныя вочы): «Они всегда препятственного цвета».

Не магу не адзначыць і недастатковую патрабавальнасць паэтэсы да рыфмы. Побач з рыфмамі дабраякаснымі, свежымі, што называецца сучаснымі, даволі часта мільгаюць і застарэлыя (лесов—стволов, снегами — городами, такие — роковые, враг — табак, ресницы — задымится), і занадта прыблізныя, такія прыблізныя, што ўжо не маюць практычнага значэння. Напрыклад: отдала — плода, небеса — да, потом — пород і г. д...

...Сваю кнігу С. Яўсеева адкрыла вершам «Восхожденье» («Узыходжанне»).

Восхожденье! Что ни день, то вышка.
Крым потом, пока еще Сибирь.
Я еще не родила мальчишку,
Я еще не растеряла сил.
Первый дом еще не получила,
Первый долг еще не отдала.
Сад возделала — не надкусила
Первого плода!

Верш, як бачым, характэрны для паэтэсы — і рыфмамі, і сваёй сутнасцю. І ў першую чаргу гэтым вось праграмным: «Крым потом, пока еще Сибирь». Крым — гэта спакой, спачын, ціхі плёскат хвалі і пляжнае забыццё (глядзіце верш «На пляже»). Сібір— гэта нязведанасць, дарога, цяжкасці, пошукі, гэта — узыходжанне. І хочацца пажадаць С. Яўсеевай, каб узыходжанне яе працягвалася, каб яна заўсёды верыла так, страсна і цепарушна, у тую светлую зорку, пра якую яна піша ў паэме. Бо паэзія — таксама вера. У самым зямным і самым чалавечым сэнсе гэтага слова.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

За прыватным фактам — важная праблема

ЧАМУ МАЛА ВЕДАЮЦЬ НАВАТ ЛЕПШЫЯ?

Артыкул дацэнта кафедры беларускай літаратуры БДУ імя Ул. І. Леніна А. Лойкі «А гэта ж былі лепшыя...» («ЛіМ» № 74, 14 верасня г. г.) не можа не ўзяць, як кажуць, за жывое кожнага, хто выкладае ў школе родную літаратуру, хто душою хварэе і за яе, і за веды сваіх вучняў. У гэтым артыкуле з-за прыватных фактаў і прыкладаў на ўвесь рост паўстае праблема эстэтычнага, а ўрэшце, калі зірнуць шырэй, камуністычнага выхавання школьнікаў, закранаецца наш прафесіянальны настаўніцкі гонар, сям-там праглядвае, хацеў гэтага аўтар ці не, сумненне ў дзейснасці нашай працы, бо «не навучыць вучняў вызначаць тэму і ідэю твора, — як заўважае А. Лойка, — гэта значыць не даць ім самага элементарнага».

Няма патрэбы разважаць аб пазнавальна-выхаваўчым і эстэтычным значэнні літаратуры, аб тым, што яна — найпершы школьны прадмет, дзякуючы якому фарміруецца маральна-этычнае аблічча падрастаючага пакалення, фарміруецца яго светапогляд. Пра гэта шмат і пішацца, і гаворыцца. А між тым веданне вучнямі беларускай літаратуры, цікавасць да яе з кожным годам зніжаюцца. Пра гэта якраз і вядзе доказную гаворку А. Лойка, які сёлета (і не ўпершыню) прымаў уступныя экзамены на філалагічны факультэт універсітэта.

Выпускнікоў школ папракаюць у артыкуле за няведанне жыццёвага і творчага шляху «праграмных» пісьменнікаў, этапаў развіцця беларускай літаратуры, за кульганне на абедзве нагі ў пытаннях тэорыі літаратуры і мастацкага аналізу твораў, за сацыялагізатарскі падыход да літаратуры і схематызм мыслення, за беднасць і шэрасць мовы, за адсутнасць самых атульных ведаў пра літаратуру сённяшняга дня і г. д.

Як ні горка гэта, я, настаўнік, вымушаны прызнаць, што аўтар мае рацыю. Больш таго, калі быць шчырым да канца, то пералічэнне прабелаў у ведах нашых вучняў можна было б і прадоўжыць.

Скажу адразу: віну за гэта ў першую чаргу павінны ўзяць на сябе настаўнікі. Але ці адны мы вінаваты? Ці толькі ад нас, ад нашых ведаў і ўмення залежыць усё? Не і яшчэ раз не!

Перш-наперш, ніводзін школьны прадмет так не «пакрыўджаны» колькасцю ўрокаў, як беларуская літаратура. Тое, што, здавалася б, па самой логіцы рэчаў павінна б было вылучацца ў сетцы вучэбных гадзін на першы план, стаіць у ёй чамусьці на самым апошнім. Вось праграма за мінулы год. На вывучэнне ў 5—11-х класах творчасці Я. Купалы, напрыклад, адведзена трыццаць дзве гадзіны; жыццёвага і творчага шляху К. Чорнага — шаснаццаць; біяграфіі і паэзіі П. Броўкі — восем. Сёлета ж гадзін на беларускую літаратуру «адпушчана» яшчэ менш. Скажам, Якуб Колас. Ці атрымае выпускнік сапраўды сярэднюю адукацыю, калі ён не вынесе са сцен школы хоць бы частачку таго невымернага духоўнага багацця, што пакінуў у спадчыну наш класік? А выпускнік вынясе занадта мала, таму што на вывучэнне нават такіх мастацкіх глыб, як «Новая зямля» і «На ростанях» прыпадае па тры—чатыры гадзіны! Не трэба забываць пры гэтым яшчэ і пра спецыфіку саракапяцімінутнай школьнай гадзіны: арганізацыя класа, час на апытанне і інш.

Веды вучняў па любому прадмету залежаць, хоць і ў рознай ступені, ад двух настаўнікаў. Адзін з іх ходзіць у клас, праводзіць урокі; другі — гэта падручнік і тая літаратура, што дапаўняе, пашырае яго. Падручнік мае істотнае значэнне не толькі для вучня, але і для настаўніка. Падручнікі ж па беларускай літаратуры, асабліва для старэйшых класаў, ужо не задавальняюць нас— пачынаючы ад біяграфій пісьменнікаў і канчаючы паасобнымі пытаннямі тэорыі. Аб гэтым ужо неаднаразова гаварылася і пісалася, рабіліся заўвагі, даваліся парады. Аднак, як кажуць, воз і сёння там. Праўда, з году ў год на тытульных старонках падручнікаў можна прачытаць: «Выданне трэцяе, перапрацаванае», «Выданне чацвёртае, перапрацаванае і дапоўненае» і г. д. Але па сутнасці ўсе гэтыя «перапрацоўкі» і «дапаўненні» толькі новыя латкі на старой адзежыне. Добра было б, каб у стварэнні падручнікаў прымалі ўдзел самі пісьменнікі. Іх больш даходлівае, эмацыянальнае слова, слова пра паплечнікаў і калег па пяру, пра сябе і свае творы прынесла б толькі карысць.

Вельмі патрэбны (за гэта настаўнікі «галасавалі» ўжо неаднойчы) і вучням, і нам хрэстаматыі для дзевятых—дзесятых класаў і найперш хрэстаматыі па сучаснай літаратуры. Творы беларускіх пісьменнікаў набываюцца сельскімі і школьнымі бібліятэкамі зрэдку. Не гавару ўжо пра літаратуру сённяшняга дня, пра перыёдыку. Паспрабуйце правесці з вучнямі дыспут на таму ці іншаму твору, што з'явіўся ў чарговым нумары «Полымя» ці «Маладосці». Калі і знойдзецца ў ваколіцы адзін—два экземпляры часопіса, дык і тады вы зможаце зрабіць гэта не раней, чым пісьменнік напіша новую рэч. Не часта сустрэнеш у сельскіх бібліятэках клубаў і школ падшыўкі газеты «Літаратура і мастацтва». Вось і патрабуйце пасля гэтага ад выпускнікоў, каб яны хоць у агульных рысах разбіраліся ў сённяшнім літаратурным працэсе.

Неабходна «ажывіць», пашырыць і павялічыць тыраж кніг з серыі «Школьная бібліятэка». У гэтай сувязі не магу не нагадаць адной мясціны з «Лістоў за сіні Дунай» Ніла Гілевіча, змешчаных у вераснёўскім нумары «Полымя». Н. Гілевіч піша, што творы Хрыста Боцева, Івана Вазава, Любена Каравелава, Хрыста Смірненскага, Ніколы Вапцарава выходзяць у серыі «Бібліятэка школьніка» тыражамі па 50, 80 і 100 і нават 150 тысяч экземпляраў, выходзяць амаль штогод, а гэта значыць, што практычна кожны балгарскі школьнік мае свой уласны томік любімага паэта або пісьменніка. Чаму б не пераняць і нам гэтую добрую практыку балгарскіх сяброў?!

Абдзелены гадзінамі, не забяспечаны ці вельмі мала забяспечаны якаснымі вучэбнымі дапаможнікамі (не кажучы ўжо пра наглядныя, якіх наогул амаль няма), настаўнік роднай літаратуры, у параўнанні з іншымі выкладчыкамі, не можа пахваліцца і ўвагай да свайго прадмета з боку метадыстаў. Метадычных выданняў, па-першае, вельмі мала: па-другое, яны нярэдка пазбаўлены арыгінальнасці, а то і проста бездапаможныя.

Акрамя завочнай, настаўнік часам атрымлівае і непасрэдную, «мясцовую» метадычную дапамогу. Гэта — наведванне, а пасля і разбор урокаў дырэктарам, завучам, інспектарамі райана, іншы раз аблана.

Але, не лічачы чамусьці беларускую літаратуру «важным» прадметам, правяральшчыкі, як правіла, на яе ўрокі ходзяць вельмі рэдка; акрамя гэтага, часта вымушае жадаць большага літаратурная дасведчанасць саміх правяраючых, якія часамі з цяжкасцю гавораць па-беларуску, нічым не цікавяцца, за выключэннем адзнак у журнале,—ні работай літаратурнага гуртка, ні насценнай літаратурнай газетай, ні тым, хто з вучняў спрабуе пісаць.

Да прычын, што адмоўна ўплываюць на веды вучняў па літаратуры, нельга не аднесці беспадстаўны, я б сказаў, нейкі безадказны погляд кіраўнікоў многіх школ і аддзелаў народнай асветы на выкладанне беларускай літаратуры, як на зусім простую, лёгкую справу. Такі погляд часта сказваецца на камплектаванні школ кадрамі настаўнікаў. Да чаго гэта прыводзіць, можа сведчыць адзін, амаль анекдатычны, прыклад. Хлопец не вучыўся, а ледзь-ледзь ліпеў у школе ўсе адзінаццаць гадоў. Баючыся нават думаць пра інстытут, гэты выпускнік, правільней — «выштурхнік», дзіця працэнтаманіі падаецца ў настаўнікі і прызначаецца выкладчыкам фізкультуры і... беларускай літаратуры. Маўляў, там выручыць мяч, тут — уменне вучняў чытаць. На жаль, выпадак гэты не выдуманы.

Многае ў нашай працы не залежыць ад настаўніка. Але шмат у чым вінаваты і мы. Заўважу наперад: настаўнік заслугоўвае самай глыбокай павагі. І ўсё ж ёсць (і не адзінкі!) сярод нас такія, што проста не здолеюць—віна гэта ці бяда іх—даць вучням належныя веды па літаратуры.

Што перш за ўсё патрэбна выкладчыку літаратуры? Агульнапрызнана — ведання прадмета, любві да яго і сякога-такога метадычнага спрыту малавата. Неабходна яшчэ (дзіўна гэта гаварыць) добрае, калі не дасканалае валоданне мовай і, самае галоўнае, здольнасць успрымаць прыгожае, здольнасць перадаваць гэтае ўспрыманне другім. Ні падручнік, ні метадычны дапаможнік не падкажуць настаўніку-літаратару, які не мае эстэтычнага густу, якім чынам «паварочваць» перад вучнямі апавяданне або верш так, каб бачна было ўсе тое багацце, якое яны тоўсць у сабе. А менавіта адсюль пачынаецца цікавасць школьніка да літаратуры, а значыць, і гарантыя ведання яе.

А. Лойка ўспамінае ў артыкуле пра бытаванне сярод абітурыентаў легенды, згодна з якой на філалагічным факультэце лёгка вучыцца: маўляў, пачытвай кніжкі ды пераказвай іх. Далам да гэтага: многія лічаць, што не толькі вучыцца, а і паступаць на філфак лёгка.

Ці не вінаваты ў гэтым зноў такі, мы, настаўнікі? Думаю, што так. Найбольшая хвароба, якая ўласціва многім з нас, а выкладчыкам літаратуры ў асаблівасці, і якая не можа не ўплываць адмоўна на адносіны вучняў да гэтага прадмета, — наша няведанне роднай мовы, да крыўднага дрэннае валоданне ёю. Пабывайце на ўроках, прыслухайцеся, як на іх і па-за імі гавораць нашы настаўнікі. Не перабольшу, калі скажу, што ў некаторых запас «чыстых» літаратурных слоў не перавышае сотні. Астатняе — моўны вінегрэт. Ці не такая, з дазволу сказаць, «мова» і з'яўляецца ў значнай меры грунтам для «нігілізму» выпускнікоў? І ці не гэтым можна вытлумачыць адсутнасць у іх любві да слова, разумення і адчування яго, ці не гэтым трэба тлумачыць нізкую вусную і пісьмовую моўную культуру абітурыентаў?

Нарэшце, у нас не звяртаецца ўвагі на выяўленне і заахвочванне літаратурных талентаў школьнікаў. Існуюць жа, як слушна заўважае А. Лойка, алімпіяды юных матэматыкаў, фізікаў, хімікаў. А чаму б не збіраць і найбольш здольных да літаратуры вучняў, а таксама тых, хто сам спрабуе пісаць, не абмяркоўваць іх сачыненняў і мастацкіх твораў, не адзначаць паларункамі лепшых? Яшчэ лепш было б, каб на такіх літаратурных алімпіядах прысутнічалі нашы «праграмныя» і «непраграмныя» празаікі і паэты...

Я назваў некаторыя з прычын таго, чаму веды па беларускай літаратуры нават лепшых выпускнікоў сярэдніх школ недастаткова поўныя і глыбокія. Але назваць прычыны — гэта толькі паставіць пытанне. Калі мы хочам вырашыць яго, трэба перш-наперш, каб літаратура з падчаркі, якой яна з'яўляецца для аўтараў праграм, стала раўнапраўнай сястрой у сям'і школьных дысцыплін. За ажыццяўленне гэтай задачы трэба ўзяцца ўсім—настаўнікам, таварышам з Міністэрства асветы, пісьменнікам—усім, хто мае дачыненне да роднай мовы і літаратуры, да іх выкладання ў школе.

М. ЦІХАНЧУК,
настаўнік Варнянскай сярэдняй школы.

Астравецкі раён.

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь». «Будущность» Э. Самуйленка (пераклад на рускую мову С. Родова), «Сэрца насцеж» А. Астрэйкі, «Вера і яе таварышы» Г. Мушынскай-Гофман (пераклад на беларускую мову Я. Бяганскай), «Свет Купалы» Р. Бярозкіна, «Як зробіш ты!» Х. Пук (пераклад М. Гурыны).

АБМЕРКАВАННЕ РАМАНА УЛ. КАРАТКЕВІЧА

У Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР адбылося абмеркаванне новага рамана Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім». З уступным словам выступіў кандыдат філалагічных навук П. Дзюбайла. Больш падрабязна прааналізаваў твор аспірант С. Андраюк.

У абмеркаванні рамана Ул. Караткевіча прынялі ўдзел доктар філалагічных навук Ю. Пшыркоў, кандыдат мастацтвазнаўчых навук П. Міско, кандыдаты філалагічных навук В. Зайцаў, А. Мальдзіс, супрацоўнік Інстытута гісторыі М. Біч, супрацоўнік Інстытута мовазнаўства М. Шушкевіч, мастак Л. Баразна, кандыдат філасофскіх навук Ул. Конан, пенсіянер Язэп Сушынскі.

У заключэнне выступіў Ул. Караткевіч.

Сёлета летам мне выпала з'ездзіць у часці Беларускай ваеннай акругі. Знаёміўся, як жывуць, вучацца і адпачываюць воіны. У мяне былі цікавыя сустрэчы з цікавымі людзьмі — рамантыкамі, абветранымі сонцам на палігонах. Засталося шмат успамінаў, яны мне спатрэбяцца для твора пра тых людзей, пра якіх я марыў калі-небудзь напісаць.

Героі эцюдаў, якія я прапаную чытачу,—людзі, што служаць у Н-скай часці.

Аўтар.

Іван ПТАШНІКАЎ

Эцюды з Н-скай часці

1. ПАКОЙ БАЯВОЙ СЛАВЫ

Яны, маладыя афіцэры, толькі вось прыехалі з горада — дамчалі з вакзала аўтобусам — і сядзелі цяпер пад ліпамі, дзе падаў цень. Асеннее неба было яшчэ празрыстае і цёплае, як летам. Ад напаленай сонцам зямлі дыхала сухім пяском і асфальтам.

Недзе далёка быў горад — там стаяў роўны і ціхі гул; пасля тахкаў цягнік, папамінаючы пра далёкую дарогу, якая прывяла іх сюды, у беларускі горад. Гэты горад яны ведалі...

У іх выдалася вольная хвіліна: камандзір часці, які іх павінен быў адразу сустрэць, быў на занятках, і яны чакалі.

І тады да іх прыйшоў маёр Лухаўской, работнік палітаддзела. Маладыя афіцэры хуценька ўсталі, надзелі фуражкі. Збіліся ў кучку, акружыўшы маёра. Гэта быў першы чалавек, які іх сустрэў і з якім яны цяпер, відаць, будуць служыць. Гэта быў і першы на гэтым канцы дарогі поціск рукі, першая ўсмешка...

— Маёр Лухаўской...

Голас у маёра мяккі, у ім адчуваецца штосьці простае, шчырае і клапатлівае.

Як даехалі, з якіх вучылішчаў... Ці спадабалася Беларусь, ці прыгожы горад... Восень, а, глядзіце, як яшчэ горача... Не заўсёды так бывае. Ці ёсць жанатыя. Халастых, маўляў, хоць і жартам сказана, а і тут уладкаваць лягчэй...

Яны не думалі, што іх так сустрэнуць. Кожнаму чамусьці здавалася, што іх будуць сустракаць інакш, а не так, як сустрэў гэты просты з выгляду, ужо ў гадах чалавек.

Яны, спяшаючыся, сталі падаваць яму рукі:

— Уладзімір Панфёраў... Землякі мы, відаць, з вамі, таварыш маёр. Акцэнт наш...

— Мікалай Парахаўнік. Украінец. З Уладзіміра-Валынска. Тут, у горадзе, сваякі нават недзе ёсць. Знайду калі-небудзь...

— Уладзімір Нагорны... Здалёку. Узбекістан.

— Тры танкісты, таварыш маёр. Як у песні. А я з Кастрамы. Ніколі не думаў, што выпадзе служыць у Беларусі.

Гэта лейтэнант Ілья Смірноў. Ён артылерыст. Прыземісты, шырокі ў плячах. Стаіць воддаль, гаворыць не спяшаючыся, з хітрай усмешкай.

— Ды вас тут тры разы па тры ды яшчэ з гэтулькі,—усміхаецца маёр, вітаючыся.

Казалі пасля, што гэта маёр запрасіў маладых афіцэраў, каб яны перш-наперш наведалі пакой баявой славы; а маёр адгаворваўся.— бачыце, гэта маладыя афіцэры папрасілі паказаць самае цікавае ў часці, дзе ім давядзецца служыць. Гэта было пасля. Пасля шмат пра што гаварылі, а цяпер яны пераступілі парог пакоя, пераступілі не спяшаючыся, у задуменні, нібыта наперад зрыхтаваліся ўсё ўгледзець і запамятаць.

Іх спаткала суровая, густая цішыня і халадок. Пасля гарачыні лёгка было дыхаць. Яны асцярожна знялі фуражкі і трымалі іх у руках. Маўчалі. Маёр кіўнуў галавой, паказаў ім, каб яны зручней сталі ля панарамы баявога шляху часці, — панарама займала палову пакоя. Яны ціхенька расступіліся і маўчалі. Можа таму, што маўчаў маёр. Ад сцяны цяпер проста на іх глядзеў бронзавы салдат з аўтаматам на грудзях...

— Наша часць, у якую вам выпала прыехаць служыць, нарадзілася ў цяжкія для нашай краіны дні...— у руках маёра Лухаўскога ўказка; голас у яго цяпер роўны і цвёрды. Вочы сталі раптам глыбокія і глядзелі цяпер у адно месца, недзе на рог стала,— было відаць, што гэты чалавек цяпер многа думае. Можа пра тое,— як бы за гэтую кароткую хвіліну сказаць маладым афіцэрам, сынам, лічы, самае важнае, можа быць тое, што ім вунь як спатрэбіцца пасля ў жыцці. Жыццё ж у іх толькі пачынаецца. А гісторыя гераічнай гвардзейскай часці, якая прайшла вайну,— гэта не проста гісторыя. Гэта — людзі. Іх лёс. Іх подзвігі. У часці шмат Герояў Савецкага Саюза...

Нізка вісяць над панарамай баявога шляху лямпы; успыхнулі на зялёным покрыве малінавымі агеньчыкамі гарады і вёскі — месцы нядаўніх яшчэ баёў. Сціплыя маладыя людзі ў новенькіх мундзірах, пад гальштукамі, у начышчаных да бляску чаравіках, з лейтэнанцкімі пагонамі схіліліся над зялёнай панарамай; аблакаціўшыся, падпёрлі рукамі падбародкі.

— Яна абараняла гераічны горад на Волзе...

Пад рукой у маёра пстрыкнуў рычажок магнітафона. Закруцілася лента. У пакой, нібыта аднекуль здалёку, прынеслася суровая музыка, і трывожны голас дыктара змусіў іх здрыгануцца: «Шел грозный 1942 год... В жестоких боях, отбивая атаки превосходящего в силах противника... Вечная слава героям, павшим...»

Зноў стала ціха. У некага з-пад локця выслізнула фуражка і ўпала на падлогу. Двое хуценька нагнуліся падымаць яе, пасля вінавата, як вучні, глядзелі на маёра.

— Справа ад вас планшэт — бітва за горад Н... Сорак чацвёрты год. Тут былі кровапралітныя баі...

Яны ступілі за ім—пайшлі адзін за адным, несучы ў руках фуражкі, у другі пакой.

— Калі ласка... Гэта ветэраны часці...— указка падымаецца ўгору і паволі паўзе ўздоўж сцяны.— Гэта зброя часці, якая здабыла ёй славу. А гэта кавалерыйская бурка... Шашка... Кулямёт Дзегцярова. Максім...

З пакоя ў пакой яны ішлі моўчкі, не зачапіўшы адзін аднаго ні словам,— кожны думаў пра нешта сваё...

— А гэта наш сённяшні дзень. Сучаснасць... Вашы равеснікі...— зноў указка падымаецца ўгору і паўзе па сцяне.— Выдатнікі баявой і палітычнай вучобы... І вам жадаю стаць імі...— маёр, здалося, нечага ўсміхнуўся:—Хачу сказаць, каб вы цяпер самі прыходзілі ў наш, цяпер ужо і ваш, пакой славы і прыводзілі сюды сваіх салдат. А салдаты ў нас — зіркіце... Гэта за выдатную вучобу. Сцягі гаркома і абкома...

Яны падыходзілі да цяжкіх, у густой шаўковай чырвані, сцягаў: да аднаго, да другога...

— Якія цяпер у вас, таварышы, будуць да мяне пытанні?

Яны зноў акружылі, збіўшыся ў кучку, маёра Лухаўскога, як і тады на двары.

Доўга гаварылі яшчэ...

Людзі сустрэліся першы раз, толькі вось пазнаёміліся, але было відаць, што спадабаліся адзін аднаму. І хто ведае, можа гэтаму віной была вольная хвіліна, якая неяк неўпрыкмет знайшлася ў іх.

Неўзабаве на ганку паявіўся дзяжурны...

Маладых афіцэраў чакаў камандзір часці.

2. РАДАВЫ КАСЫМАЎ

Ён зусім не думаў, што ў гэты дзень пра яго, Касымава, будзе гаварыць сам камандзір часці. Ды яшчэ калі будуць сабраўшыся ўсе салдаты і афіцэры...

Касымаў сядзеў у заднім радзе, ля самых дзвярэй. Ён зайшоў самы першы, і яго доўга тоўхалі салдаты, што па аднаму ішлі і ішлі ў залу. Потым іх найшло гэтулькі, што ў клубе, здавалася, недзе будзе сесці. Пасля ўжо Касымаў убачыў, што сядзяць усе, ніхто не стаіць, і што людзі прыціхлі. Неўзабаве праз пярэднія дзверы ўслед за камандзірам часці зайшоў прапагандыст і сакратар парткома. Толькі цяпер прыбег сержант Анмегікян, намеснік сакратара камітэта камсамола,—недзе быў загрымаўся. Яны ўзышлі на сцэну, дзе стаяў засланы сукном стол і крэслы. У зале стала ціха, пачуўся моцны салдацкі пошапт, заскрыпелі крэслы,— нехта яшчэ ніяк не мог знайсці сабе месца.

Праз расчыненае насцеж акно ў клуб зірнула блакітнае гарачае неба і здалёку з двара — са спартыўнай пляцоўкі—данесліся густыя галасы... Была субота, другая палова дня.

Калі да трыбуны падышоў маёр Тамілін, Касымаў угледзеў, як яфрэйтар Міхась Вярбіцкі і радавы Талыбаў Сахраб, што сядзелі ў яго наперадзе, павярнулі да сцэны галовы. Яму чамусьці прыйшло ў галаву, як яны ранішай беглі на тры кіламетры, пасля пайшлі на заняткі ў парк. Яму яшчэ падумалася, што Вярбіцкі і Талыбаў самыя выпослівыя і што яны непадобныя адзін на аднаго. Вярбіцкі невысокі, сарамлівы, здаецца, зусім яшчэ хлапчук, а шофер Талыбаў — рослы, шыракаплечы. Талыбаву і бегчы недзе было лягчэй, чымся Вярбіцкаму. Ён падумаў пасля, што толькі нядаўна вярнуўся з дому, успомніў чамусьці старое аддзяленне, дзе ён лічыўся «няўстойлівым»...

Ён стаў слухаць маёра Таміліна, які гаварыў пра вайну на Далёкім Усходзе, пра дваццацігоддзе перамогі над Японіяй. Гаварыў спакойна, цікава... Яго добра было слухаць і, слухаючы, успамінаць мінулае...

Калі пасля маёра Таміліна слова ўзяў камандзір часці. Касымаў неяк аж нахіліўся ўперад. Ён заўсёды любіў слухаць гэтага чалавека з абветраным, загарэлым тварам і спакойнымі, удумлівымі вачыма. Гэты чалавек з добрай душой да людзей... Гэта ён, лічы, даў яму і кароткатэрміновы водпуск. Калі б не ён...

Камандзір часці гаварыў пра батарэю, якраз пра тую, дзе Вярбіцкі і Талыбаў. Ён так і сказаў: «Батарэя дабілася поспехаў у баявой падрыхтоўцы». Касымаву здалося, што камандзір часці раптам возьме ды і пахваліць Вярбіцката і Талыбава. Але ён не пахваліў, а пачаў адразу гаварыць пра задачы салдат.

— У першую чаргу быць боегатоўнымі... Не дапускаць памылак... — гаварыў камандзір часці.—Трэба берагчы тэхніку, якая дорага каштуе. Кожны салдат, які разумее ў тэхніцы, павінен памагаць камандзірам трымаць яе заўжды падрыхтаванай. Зразумейце сваю задачу не вузка... Гэта ваша справаздача Радзіме.

— Зразумела, таварышы?—спытаў ён нарэшце.

— Так то-очна...—адказалі салдаты.

— Што не дружна?

Стала на хвіліну ціха. І тут ён, Касымаў, не стрымаўся, пацягнуў нехта за язык:

(Заканчэнне на 4-й стар.)

У НАШЫХ СЯБРОЎ

УРАДЖАЙ ДОБРЫХ СПРАЎ

Мне выпаў высокі гонар быць у Народнай Венгрыі. Многа цікавага і павучальнага ўбачылі мы ў нашых сяброў.

Дзесяць дзён, што былі мы ў Венгерскай Народнай Рэспубліцы, праляцелі непрыкметна. Гэта былі дні знаёмства і вывучэння бібліятэчнай справы ў Народнай Венгрыі.

Асабліва мне запомніліся сустрэчы з цікавымі, разумнымі людзьмі, сапраўднымі энтузіястамі бібліятэчнай справы. Іх у Народнай Венгрыі многа. Гэта прафесар, загадчык кафедры бібліятэказнаўства Будапешцкага універсітэта, старшыня Усевенгерскага (міжведамаснага) бібліятэчнага савета тав. Ковач, буйнейшы спецыяліст у краіне ў гэтай галіне, палымяны, нястомны энтузіяст сваёй справы. Запомніліся сустрэчы і гутаркі з дырэктарам Капашварскай абласной бібліятэкі Бернатам Келнерам, работнікамі Цэнтра бібліятэказнаўства і метадычнай работы тт. Барабашу, Шалаі, Патакі, Будаі і многімі іншымі таварышамі. На гасціннай венгерскай зямлі яны акружылі нас цёплай увагай і клопатамі. Мы былі ў добрых, сардэчных сяброў, якія ахвотна расказвалі і пра свае дасягненні, і пра цяжкасці ў рабоце, раіліся з намі. Словам, такое падарожжа нельга забыць.

У гэтых кароткіх нататках мне хочацца расказаць пра найбольш цікавае і карыснае ў рабоце венгерскіх бібліятэк.

Бібліятэчная справа ў Народнай Венгрыі пастаўлена шырока, на глыбокай навуковай аснове і служыць справе камуністычнага выхавання народа, што паспяхова будуе сёння сацыялізм. Прыкметна вялікая прадуманасць у арганізацыі навуковай, метадычнай і бібліяграфічнай работы, выразнае размежаванне функцый навуковых і масавых бібліятэк і разам з тым каардынацыя іх дзейнасці.

Нам прыемна было даведацца, што аб узроўні навуковай работы ў бібліятэках Венгрыі клапоцяцца самыя высокія ўрадавыя органы. У краіне створаны ўмовы для паспяховай навуковай работы. Урад паклапаціўся забяспечыць бібліятэкі дастатковай колькасцю штатных адзінак. Так, напрыклад, у бібліятэцы імя Сечэні працуюць звыш 300 чалавек. У адным толькі Цэнтры бібліятэказнаўства і метадычнай работы (вядучы аддзел гэтай бібліятэкі) занята 42 высокакваліфікаваныя спецыялісты, пры наяўнасці ў абласных (іх у краіне 19), цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэках па 1—2 метадысты. Для навукова-даследчай работы адводзяцца спецыяльна 2—3 дні на тыдзень. Вялікім стымулам з'яўляюцца таксама штогадовыя конкурсы на лепшую даследчую работу, устаноўлены грашовыя прэміі.

Цэнтр вывучае найбольш важныя праблемы ў галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. Гэта ў прыватнасці такія пытанні: фарміраванне матэрыялістычнага светапогляду ў чытачоў; вывучэнне грамадскай узаемасувязі паміж кнігай і бібліятэчнай культурай; выхаваўчая работа бібліятэкі; удасканаленне бібліятэчнай справы і г. д. Сярод выдадзеных работ высокую ацэнку атрымалі наступныя тэмы: «Эканамічнасць і эфектыўнасць бібліятэчнай работы», «Вывучэнне чытацкіх інтарэсаў», «Уплыў узроўню жыцця на чытанне кніг» і рад іншых.

Цяпер некалькі слоў аб арганізацыйнай структуры Цэнтра бібліятэказнаўства і метадычнай работы. Ён складаецца з чатырох аддзелаў: метадычны аддзел масавых бібліятэк, аддзел навуковых і спецыяльных галіновых бібліятэк, аддзел адукацыі (падрыхтоўкі кадраў) і аддзел інфармацыі.

Важныя праблемы вырашае аддзел масавых бібліятэк Цэнтра. Ён займаецца планаваннем і размяшчэннем сеткі, тыпавым абсталяваннем бібліятэк, арганізацыяй іх кніжных фондаў, механізацыяй бібліятэчных працэсаў. Адно можна сказаць, што гэтыя пытанні надзённыя і для нашых бібліятэк.

Два разы на месяц аддзел выдае бюлетэнь «Новыя кнігі», які знаёміць не толькі з літаратурай, што выйшла ў свет, але, галоўным чынам, з кнігамі, што рыхтуюцца да друку. Бюлетэнь выпускае рэдакцыя ў складзе сямі чалавек. Рэдкалегія мае магчымасць запрасіць супрацоўнічаць у бюлетэні самых кваліфікаваных аўтараў. Для гэтай мэты ёсць ганарар.

Раз на квартал аддзел выдае «Каляндар знамянальных і памятных дат» і як дадатак да яго — спецыяльныя выстаўкі і плакаты. Гэта намнога павышае культуру афармлення бібліятэкі, аблягчае працу масавага бібліятэкара.

Бюлетэнь «Новыя кнігі» выдае і наша Ленінская бібліятэка з той толькі розніцай, што ў нас ён выходзіць раз на месяц.

А цяпер нагадаю пра метады, якімі карыстаюцца венгерскія бібліятэкары пры вывучэнні чытацкіх інтарэсаў. Праблема гэтая складаная, яна аднолькава хвалюе венгерскіх таварышаў і савецкіх бібліятэкараў. Работнікі аддзела масавых бібліятэк Цэнтра не абмяжоўваюцца аднымі анкетамі (хоць і іх не пазбягаюць), а шырока карыстаюцца метадам апытання, увязваючы гэтую праблему з сацыяльнымі, культурнымі і псіхалагічнымі момантамі. Шырока ўжывалася пры гэтым навейшая апаратура і перфакарты.

Заслугоўвае ўвагі работа метадычнага аддзела навуковых і спецыяльных галіновых бібліятэк Цэнтра. Ён займаецца пытаннямі каардынацыі работы навуковых бібліятэк краіны, вывучае важнейшыя праблемы ў іх дзейнасці.

Мы пазнаёміліся з работай Дзяржаўнай бібліятэкі імя Сечэні і бібліятэкай Венгерскай акадэміі навук. На іх вопыце пераканаліся, што функцыі навуковых бібліятэк у краіне выразна акрэслены, што не заўсёды бывае ў рабоце дзяржаўных бібліятэк нашых саюзных рэспублік. Гэтыя дзве бібліятэкі абслугоўваюць у першую чаргу навуковых работнікаў і спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі. Абедзве бібліятэкі праводзяць вялікую навукова-даследчую работу. Глыбока вывучаюць яны свае фонды, працуючы літаральна з кожнай кнігай, вядуць даследаванне найбольш каштоўных сваіх скарбаў. Паміж навуковымі бібліятэкамі выразна размежаваны профіль іх камплектавання, іх метадычныя і бібліяграфічныя функцыі. У той жа час многае робіцца па каардынацыі іх дзейнасці, у прыватнасці, у галіне замежнага кнігаабмену, міжбібліятэчнага абанемента і бібліяграфіі.

Дзяржаўная бібліятэка імя Сечэні — цэнтральнае нацыянальнае кнігасховішча ў краіне, якое збірае перш за ўсё венгерскую літаратуру і кнігі аб Венгрыі. З 1803 года бібліятэка атрымлівае абавязковы экзэмпляр усёй кніжнай прадукцыі краіны. Бібліятэка імя Сечэні не толькі нацыянальнае кнігасховішча, але і цэнтр метадычнай і бібліяграфічнай дапамогі як масавым, так і навуковым бібліятэкам.

У бібліятэцы пакуль што чытачоў нямнога, яна мае толькі 88 месц у чытальных залах. Але хутка бібліятэка атрымае новае памяшканне, і тады значна пашырыцца абслугоўванне чытачоў.

Мне хацелася б яшчэ нагадаць і пра выдавецкія справы бібліятэкі. Яна выдае «Штогоднік» — серыі бібліяграфічных даведнікаў па літаратуры суседніх народаў і культурных сувязей Венгрыі з заграніцай. Выходзіць у свет і Агульнадзяржаўны спіс новых паступленняў, у якія ўключаюцца замежныя творы, набытыя венгерскімі бібліятэкамі, а таксама «Венгерская нацыянальная бібліяграфія» і г. д.

Бібліятэка імя Сечэні вядзе ўлік кнігаабмену ўсіх венгерскіх устаноў і непасрэдна падтрымлівае сувязь з 400 установамі 50 краін. Вялікую дапамогу ў арганізацыі міжнароднага кнігаабмену аказвае зводны каталог кніг, які выдаецца бібліятэкай з 1942 г. і адлюстроўвае фонды звыш 250 бібліятэк краіны (навуковых і спецыяльных), маючы 2.200 тысяч каталожных картачак.

Многа цікавага ўбачылі мы і ў бібліятэцы Венгерскай акадэміі навук. Побач з унікальнымі кнігамі, каштоўнымі рукапісамі і дакументамі, у бібліятэцы сабраны асноўныя навуковыя працы, манаграфіі, даведнікі і дапаможнікі. Фонд бібліятэкі—каля мільёна экземпляраў кніг. Яна падтрымлівае сувязь больш чым з 1 700 установамі 86 краін. Бібліятэка збірае літаратуру па марксізму-ленінізму, выданні зарубежных акадэмій навук і літаратуру аб іх дзейнасці, а таксама па пытаннях арганізацыі і планавання навукова-даследчай работы, асноўныя працы ў галіне грамадскіх і прыродазнаўчых навук, творы класікаў і лепшыя творы сучаснай мастацкай літаратуры. Як навуковая спецыяльная бібліятэка яна набывае літаратуру па старажытнай гісторыі, гісторыі сусветнай літаратуры, мовазнаўству, усходазнаўству. Бібліятэка абслугоўвае 21 тысячу чытачоў. Гэта ў асноўным людзі, якія займаюцца навуковай работай.

На працягу пяці год бібліятэка выдае «Бюлетэнь па арганізацыі навукі» (6 нумароў на год). Галоўны рэдактар бюлетэня — дырэктар бібліятэкі доктар Рожа — чалавек, улюбёны ў бібліятэчную справу. «Бюлетэнь» змяшчае матэрыялы аб дасягненнях зарубежнай і венгерскай навукі і бібліяграфію да іх. Бібліятэка сістэматычна працуе над серыяй «Бібліяграфія прац акадэмікаў Венгерскай акадэміі навук».

Ёсць некаторыя асаблівасці ў рабоце масавых бібліятэк ВНР. У краіне на вёсцы працуе толькі 20 працэнтаў штатных работнікаў, астатнія 80 працэнтаў—гэта бібліятэкары-аматары, што працуюць на грамадскіх асновах. Заведзен такі парадак, што гэтыя бібліятэкі бываюць адкрыты два дні на тыдзень і працуюць яны не больш дзвюх гадзін. (Вядома, абслугоўванне сельскага чытача ў нашай краіне пастаўлена значна лепш). Яшчэ некалькі год назад штатных бібліятэкараў мелі тыя вёскі, у якіх налічвалася не менш пяці тысяч жыхароў, а сёння ўжо іх маюць і тыя вёскі, дзе тры тысячы чалавек. Затое вялікая ўвага аддаецца ў Народнай Венгрыі развіццю перасоўных бібліятэк. Камплектаванне іх адбываецца цэнтралізавана абласнымі і гарадскімі бібліятэкамі.

Прыемна было даведацца, што мясцовыя партыйныя і савецкія органы аддаюць многа ўвагі матэрыяльнай базе бібліятэк. Вось чаму бібліятэкі Венгрыі маюць добрыя памяшканні і вельмі добрае абсталяванне. Мы пабывалі ў вёсцы Астапаны, у якой налічваецца каля 1500 жыхароў. Члены кааператыва пры актыўнай дапамозе і падтрымцы сакратара партыйнай арганізацыі Іожэфа Кіша і старшыні сельсавета Імрэ Хорвата пабудавалі ў вёсцы Дом культуры з бібліятэкай. Гэта — цудоўны сучасны будынак, сапраўдны палац кнігі. Вось ужо дзесяць год загадвае тут бібліятэкай калгасніца Ужэфіе Старажэнчыч. Два разы на тыдзень яна бывае ў бібліятэцы і выдае чытачам кнігі. Старажэнчыч — член партыі, самы вялікі аматар кнігі і ахвотна выконвае свае грамадскае даручэнне.

Знаёмячыся з работай бібліятэк ВНР, мы ўбачылі там шмат добрага і цікавага. Але заўважылі мы і некаторыя недахопы ў іх рабоце. У прыватнасці, нам здаецца, што ў масавых бібліятэках трэба больш аддаваць увагі нагляднай агітацыі, смялей прыцягваць да работы актыў, асабліва інтэлігенцыю. Нам здалося таксама, што ў гэтых бібліятэках недастаткова праводзіцца масавай работы сярод чытачоў. Па-сяброўску мы расказалі венгерскім таварышам, як гэтая справа наладжана ў бібліятэках Савецкага Саюза і ў прыватнасці ў Беларусі.

Нам вельмі спадабалася, як у Народнай Венгрыі рыхтуюць бібліятэчных работнікаў. Спецыялісты з вышэйшай адукацыяй рыхтуюцца ў Будапешцкім універсітэце на бібліятэчным факультэце і вучацца тут пяць год. Кожны студэнт (у тым ліку і бібфакультэта) абавязаны закончыць два факультэты (бібліятэчны і гістарычны, філалагічны і бібліятэчны і г. д.) і вывучаць дзве замежныя мовы (рускую і на выбар—англійскую, французскую ці нямецкую мовы).

Прызванне бібліятэкара —служыць свайму народу. Гэта самаахвярна і робяць нашы венгерскія калегі. Найлепшых вам поспехаў, таварышы і сябры!

Ірына САНКОВА,
намеснік дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна.

Стары Улас

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

У старых беларускіх выданнях часта сустракаюцца вершы, карэспандэнцыі, заметкі, падпісаныя валожынскім леснікам Старым Уласам. Імя яго знаходзім мы ў трохтомніку «Анталогіі беларускай паэзіі», дзе сказана, што паэт не забыты і ў нашы дні.

Але, калі гаварыць шчыра, то мы надзвычай мала ведаем яго творчасць і зусім мала знаёмы з яго жыццёвым лёсам: да апошняга часу заставаўся невядомым год яго смерці. За ўсё гэта нам крыху сорамна, бо ў сямідзесяці кіламетрах ад Мінска, у Валожыне, жывуць яшчэ нашчадкі паэта, яго знаёмыя. Дастаткова з'ездзіць туды, пагутарыць з людзьмі — і кожнаму стане Стары Улас знаёмым. Унукі паэта дадуць прачытаць з дзесятак беларускіх вершаў на лацініцы, напісаных рукой іх таленавітага дзеда. Там жа, у Валожыне, удакладняць і тое, што было сказана пра Старога Уласа раней.

Пачнём з прозвішча. Сапраўднае прозвішча паэта не Сівы, як гэта сказана ў «Анталогіі» (хоць Сівых у Валожыне вельмі многа), а Сівіцкі. Пад такім прозвішчам жылі прамыя нашчадкі паэта: тры сыны і чатыры дачкі. Праўда, два сыны загінулі ад рук фашыстаў у часе апошняй вайны, трэці памёр пасля вайны. Затое жывуць усе чатыры дачкі: дзве ў Варшаве, а дзве ў невялікім польскім горадзе Гнезна. Па словах унучкі паэта Яніны Уладзіслаўны Пысай (дачкі старэйшага сына), Стары Улас пазней устанавіў сваё сапраўднае прозвішча — і таму, відаць, дадаў яго да ўсім вядомага «Сівы» — Сівіцкі. І яго цяпер памятаюць на радзіме як Уладзіслава Уладзіслававіча Сівога-Сівіцкага.

Нарадзіўся паэт у чорны для беларускай культуры 1865 год, калі быў забаронены беларускі друк. Валожынцы і жыхары навакольных вёсак памятаюць высокага, з барадкай ляснічага Сівога-Сівіцкага, які аб'язджаў лясныя абшары графа Міхала Тышкевіча. (Дарэчы, чаму магнат даў такую высокую пасаду Старому Уласу, невядома). Але ён застаўся жыць у памяці людской не як ляснічы Сівы-Сівіцкі, а як паэт Стары Улас.

Ляснічы цікавіўся народнымі паданнямі, абрадамі, песнямі і іншымі скарбамі вуснай народнай творчасці. Часам яны давалі Старому Уласу тэму, а часам упляталіся асобнымі фрагментамі ў ягоныя творы. Пісаў ён вершы на розныя выпадкі жыцця. У яго творах жыве тэма вясковага побыту. За гэта яго і другога паэта-нашаніўца Лявона Лобіка цаніў Максім Багдановіч: «Л. Лобік і Стары Улас далі некалькі дужа няхітрых, але верных і таму цікавых малюнкаў нашай вёскі». Стары Улас прыглядаецца да руплівых жнеек, што «рэжуць скваплiва, уюць перавёслы не слабкі» (верш «Рабочы час», «Наша ніва», 1912 г.). На старонках «Нашай нівы» сустракаемся мы і з парадыйным творам «Тры зладзеі» — пра забаўных зладзеяў, якія ўкралі ў пана «пояс з золата літы», а пасля лезуць праз акно да суддзі-ваяводы, каб той дапамог ім падзяліць здабычу...

На жаль, мы не маем сёння магчымасці гаварыць шырэй пра творчасць паэта, бо ніхто ні разу не паспрабаваў сабраць яго творы хоць бы ў невялічкі зборнічак, а гэта была б удзячнасць і павага нашчадкаў да чалавека-самавучкі, які ў меру сваіх здольнасцей і магчымасцей спрыяў развіццю роднай літаратуры ў цяжкі час «сініх мундзіраў». Вядома, нялёгка, але пры жаданні можна сабраць паўсюдна раскіданыя творы. Як расказваюць нашчадкі паэта, частка асабістага архіва Старога Уласа захоўваецца дзесьці ў нашых дзяржаўных архівах, бо ўзята ў іх у 1947 годзе. Сярод узятых матэрыялаў шмат рукапісаў, падшыўкі «Нашай нівы» і лісткі «Нашай долі». Другая частка архіваў трапіла ў Польшчу, у горад Гнезна, куды выехала жонка Старога Уласа Антаніна Сівіцкая, ураджэнка Вайцяхоўская. Між іншым, родам яна таксама з Валожына. Пражыла 110 гадоў. Памерла толькі летам мінулага года...

Стары Улас не толькі збіральнік фальклору, не толькі паэт, але і публіцыст. У яго карэспандэнцыях у «Нашу ніву» мы бачым натуральную Валожыншчыну і валожынцаў — на вузенькіх палосках, у п'яных шынках, на заснежаных дарогах, пад дзіравымі стрэхамі. Стары Улас з дакорам гаворыць пра зямельны голад: «У нашай воласці вялікая зямельная цеснота. Мужыцкі надзел быў ад 8 да 12 дзесяцін, а цяпер многа людзей надзяляліся па 6, 8, 10, 16 дзесяцін, не гаворачы ўжо аб трацінах і чацвярцінах. У Валожынскай воласці жыве 13 тысяч чалавек, хат усяго 2 062, з іх 673 хаты маюць менш адной дзесяціны, 833 хаты маюць да 2 дзесяцін, 377 — ад двух да трох дзесяцін, толькі 178 хат маюць больш трох дзесяцін. На душу наогул выходзіць трохі больш, як палавіна дзесяціны. З усіх валасцей Валожынская найбяднейшая.

У нашым двары прадаецца зямля па 100 рублёў дзесяціна, а банк дасць 40—50 рублёў, дык багаты купляе зямлю, бо можа далажыць, а бедны не мае сілы купіць. Так і гінем ад малазямелля. Хто можа — выязджае ў Амерыку, Пецярбург і другія месцы».

На старонках газеты сустракаем самыя разнастайныя заметкі карэспандэнта-ляснічага. Гэтым заметкам аўтар дае даволі трапныя загалоўкі: «Канец света — бо не ўскрэсла прасвета», «Вінаватых шмат, а ў адназе Ігнат», «П'юць, п'юць і душу прадаюць» і г. д.

Але смела глянуць у корань здзекаў з працоўнага чалавека і падказаць працаўніку выйсце Стары Улас так і не здолеў, хоць выступленні сялян у Валожыне, Дубіне і іншых паселішчах, відавочцам якіх ён быў, давалі глебу для грунтоўных і сталых разважанняў.

Стары Улас пакінуў Валожын у 1921 годзе. З таго часу ён тут быў хіба толькі наездам да свайго старэйшага сына, які застаўся жыць у збудаванай бацькам хаце (цяпер вул. Савецкая, 49). Пасяліўся паэт спачатку ў Вільні з жонкай і дачкой Галенай. Пазней яны ўсе пераехалі за сорак кіламетраў у вёску Сужаны, каля Неменчыне (Літва). Жыў ён нейкі час і ў вёсцы Шэшэльгішкі, таксама паблізу ад Неменчыне. Тут паэт і памёр у канцы 1939 года.

Кожную вясну на магіле Старога Уласа зацвітаюць любімыя ім кветкі. Часам завітае сюды колішні сусед, які любіў гутарыць з паэтам. Так і здаецца, што і зараз яны вядуць гаворку:

Слоўца адно, а часам другое
Сказана мудра ў пару,
Душу асвежыць, мысль заспакое,
Як бы адверне з плеч гару.

Г. КАХАНОЎСКІ.
Маладзечна.

У фільме «Адзінота» здымаўся народны артыст СССР Глеб Паўлавіч Глебаў (на кадры ў цэнтры). Ён выконвае ролю Фрола Баева.

Кадр з фільма «Яны не пройдуць».

ФІЛЬМЫ ў лістападзе

«Адзінота» — так называецца новая двухсерыйная шыроказкранная кінааповесць, створаная рэжысёрам Усеваладам Варонінам на Адэскай кінастудыі па матывах аднайменнага рамана Мікалая Вірты.

Узнаўляючы на экране адну са складанейшых старонак рэвалюцыйнай гісторыі — правал эсэраўскага мяцяжу на Тамбоўшчыне,— аўтары фільма паказалі асуджанасць адыходзячага класа ўласнікаў і іх ідэйных натхніцеляў. Разумны і люты вораг Савецкай улады, кулак Сторажаў, які ўсё жыццё верыў у непахіснасць прынцыпу — «маё» мацнейшае, чым «наша»,—церпіць поўны крах. Але гэта толькі адзін аспект гістарычнага працэсу, адна лінія драматычных падзей карціны. Другая, яшчэ больш хвалюючая, апавядае пра тое, як, пераадольваючы заслоны контррэвалюцыйнай прапаганды, заваявала розумы і сэрцы сялянства, у прыватнасці, сераднякоў, мудрая ленінская праўда.

У галоўных ролях заняты акцёры Пётр Глебаў, Аляксандр Качаткоў, Святлана Дружыніна, Глеб Глебаў, Мікалай Лебедзеў і іншыя.

...Больш за ўсё на свеце Юсуп Ялантуш любіў зямлю. Асабліва калі, прыгрэтая веснавым сонцам, апрацаваная мазольнымі рукамі, яна пакрываецца пяшчотнай зелянінай руні. Але бядняк Ялантуш не меў зямлі. Уся яна — у руках бая Кафланбека.

Сонца далонню не закрыеш, гневу народнага бізуном не ўціхамірыш, праўды пад крысом халата не схаваеш.

А дзе яна, гэтая праўда? Хто яе і дзе бачыў? Калі яна існуе на зямлі, дык чаму не для Юсупа і мільёнаў такіх жа абяздоленых і прыніжаных, як і ён? І Ялантуш ідзе шукаць яе, праўду. Ён кідае і бярэ ружжо. Гараць байскія сядзібы, склады. Юсуп канфіскуе багацце багачоў і раздае яго бедным...

Пра ўсё гэта гледачы і даведаюцца, прагледзеўшы новую ўзбекскую мастацкую кінакарціну «Бура над Азіяй», створаную рэжысёрам Камілам Ярматавым.

У лістападзе гледачы ўбачаць шыроказкранную кінакарціну «Як вас цяпер называць?..», пастаўленую рэжысёрам Уладзімірам Чабатаровым на кінастудыі «Масфільм» па ўласным сцэнарыі, напісаным у садружнасці з Ю. Лукіным і М. Пруднікавым. У аснове фільма — сапраўдныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

На экраны рэспублікі выпускаецца яшчэ адна новая работа масфільмаўцаў — мастацкая кінааповесць «Наш дом». Аўтар сцэнарыя — Яўген Грыгор'еў, рэжысёр-пастаноўшчык — Васіль Пронін.

Галоўныя ролі выконваюць: бацькі — А. Папанаў; маці — Н. Сазонава; дзядзькі Колі — І. Лапікаў; Мікалая — В. Бяроеў; Валодзі — А. Локцеў; Дзімы — Г. Бортнікаў і іншыя.

... 1936 год. Вена. Ваенныя патрулі і аблавы на вуліцах. Барыкады. Вядуць на расстрэл шуцбундаўцаў. Масква гасцінна сустракае першы эшалон палітэмігрантаў з Аўстрыі. Першамайскі парад у сталіцы. І зноў дзеянне пераносіцца за рубеж. Парад нацыстаў у Нюрнбергу. Налёт фашысцкай авіяцыі на Мадрыд. Утаржэнне гітлераўцаў у Аўстрыю, Чэхаславакію, Польшчу, Францыю. Другая сусветная вайна. Савецкая Армія вызваляе заняволеныя краіны Еўропы. І ў фінале — парад неафашыстаў у сучаснай ФРГ.

Гэтыя хранікальныя кадры арганічна ўманціраваны ў новую мастацкую кінааповесць «Яны не пройдуць», створаную на кінастудыі «Масфільм» сумесна з кінематаграфістамі Савецкага Саюза і ГДР. Аўтар сцэнарыя — Аляксандр Ракемчук, рэжысёр-пастаноўшчык — Зігфрыд Кюн.

Асноўная ідэя фільма выказана ў яго назве. «Яны» — гэта недабітыя фашысты, якія сёння зноў узнімаюць галовы ў Заходняй Германіі, лемантуючы аб рэваншы.

У галоўных ролях заняты акцёры Юрген Фрорып, Лідзія Шпара, Сяргей Сталяроў, Іна Макарава і іншыя.

Будуць таксама дэманстравацца новая мастацкая кінааповесць «Над намі Паўднёвы Крыж» вытворчасці Кіеўскай кінастудыі імя А. П. Даўжэнкі і азербайджанскі фільм «Чароўны халат».

З зарубежных кінастужак гледачы змогуць прагледзець польскую — «Закон і кулак»; югаслаўскую — «Кругасветнае падарожжа»; швейцарскую — «Вільгельм Тэль»; польскую — «Людзі з цягніка»; амерыканскую — «Нюрнбергскі працэс» і іншыя.

ТАЙНЫ СТАРАЖЫТНАЙ КЕРЧЫ

Трыццаць гадоў назад на ўскраіне Керчы пачалося археалагічнае даследаванне Мірмекія, антычнага горада старажытнага Баспорскага царства. Кіраўнік раскопак — прафесар Інстытута археалогіі Акадэміі навук СССР, доктар гістарычных навук Віктар Гайдукевіч.

— У сёлетнім годзе Баспорская экспедыцыя, — паведаміў вучоны, — праводзіць сваю дваццатую кампанію. Мірмекій, які існаваў з VI стагоддзя да новай эры да III стагоддзя новай эры, уяўляў сабою ўмацаваны горад. Адкрыты рэшткі яго абаранальных сцен, раскапаны жылыя кварталы і іншыя збудаванні.

Горад насялялі вінаробы, рамеснікі, гандляры; знойдзены пятнаццаць вялікіх вінаробняў, многія з іх выдатна захаваліся — уцалелі расціскальныя пляцоўкі і розныя прыстасаванні. Мноства знойдзеных манет і вырабы, завезеныя з Грэцыі і Малой Азіі, сведчаць пра шырока развіты гандаль.

Нашай экспедыцыяй раскапаны руіны свяцілішча з алтаром. На яго месцы ўтварыўся вялізны курган попелу, насычанага рознымі прадметамі, якія жыхары прыносілі ў ахвяру. Атрыманы выключна багаты матэрыял, які характарызуе культуру ранняэлінскага перыяду: прылады працы, тэракотавыя статуэткі, прывазная і мясцовая кераміка, вырабы з косці, бронзы. Пад алтаром знойдзены рэшткі будынка V стагоддзя да новай эры.

Апроч таго, у сямі кіламетрах ад Керчы экспедыцыя даследуе вялікі курган Кара-оба. Яго ўжо аднойчы раскопвалі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, але не знайшлі старанна схаваную грабніцу. Цяпер удалося адкрыць манументальную кальцавую каменную агарожу (крапіду), што ахоплівае цэнтральны курган, дзе, па ўсёй верагоднасці, і знаходзіцца ўсыпальніца Баспорскага цара, якая больш двух тысячагоддзяў хавае свае тайны.

Сяргей ШАНТЫР,
карэспандэнт АДН.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

29 кастрычніка

Першая праграма. 11.00 — «Да заўтра». Шыроказкранны мастацкі фільм. 16.55— праграма перадач. 17.00 — «Табе, юнацтва!», «Апошняга пісьма не будзе». Да дня нараджэння камсамола (М). 18.00 — для малышоў. «Пеці і яго сябры». Мультыплікацыйны фільм. Трэцяя серыя. 18.15 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — К. Чапэк. «Маці». Спектакль Маскоўскага драматычнага тэатра (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «Галоўнае — эфектыўнасць». Аб выкарыстанні асноўных фондаў у калгасах і саўгасах Мінскай вобласці. 21.30 — «Малюнкі з выстаўкі». Канцэрт. 22.00 — «Літаратурная Беларусь». Тэлевізійны часопіс, прысвечаны выхаду кнігі «Дзень паэзіі».

Другая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — для вучняў другой змены. «Уральскія сцежкі» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.30 — да 48-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. «Незабыўныя сустрэчы». Расказы старых камуністаў пра Леніна. 19.30 — «Дзе вы, хлопцы?» Тэлевізійны спектакль. 21.00 — насустрач XXIII з'езду КПСС. «Ударныя, камсамольскія». Тэлевізійны рэпартаж (М). 21.35 — канцэрт па заяўках моладзі (М). 22.30 — па старонках часопіса «Молодая гвардия» (М).

30 кастрычніка

Першая праграма. 11.00 — «Дзе вы, хлопцы?» Тэлевізійны спектакль. 15.55 — праграма перадач. 16.00 — для школьнікаў. «Юны піянер». Тэлечасопіс (М). 16.50 — для малышоў. «Пеці і яго сябры». Мультыплікацыйны фільм. Чацвёртая серыя. 17.10— для дзяцей. «Мая вуліца». Тэлевізійная перадача. 17.30 — кінанарыс. 17.45 — «Народны мастак БССР А. А. Бембель». Да 60-годдзя з дня нараджэння. 18.05 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Госці нашага горада». Фільм-канцэрт. 19.00 — тэлевізійны клуб кінападарожнікаў (М). 20.05 —«Стук пашталёна». Мастацкі фільм (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «На агеньчык». Перадача з Чэлябінска.

31 кастрычніка

Першая праграма. 10.00 — для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 10.30 — для школьнікаў. Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. «Міхаіл Таль ці Барыс Спаскі?» 10.55 — «Цяжкія дзеці». Мастацкі фільм. Вытворчасць Ялцінскай кінастудыі. 12.00 — скарбы Трэццякоўскай галерэі. «Народны мастак СССР А. Дайнека» (М). 12.30 — «Тысячы сэрцаў». Рэпартаж з Цэнтральнага музея Узброеных Сіл СССР (М). 13.00 — для школьнікаў. «Архіварыус». Тэлевізійны альманах. 13.35 — «Сельскі клуб» (М). 14.35 — «Музычны кіёск» (М). 15.00 — першынство СССР па футболу. ЦСКА — «Спартак» (М). 16.45 — тэлевізійныя навіны (М). 17.00 — спартыўная перадача. 17.50— «Тут працаваў С. Маршак». Перадачу вядзе Іраклій Андронікаў (М). 18.50 — «Мая Віташа». Кінанарыс. 19.10 — «Вялікая Айчынная». Дакументальны фільм. Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 10.30 — «Белы пудзель». Мастацкі фільм (М). 12.00 — «Как мимолетное виденье». Тэлевізійная пастаноўка. 13.30 — для школьнікаў. «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс (М). 13.10 — «Хто ў цераме жыве?». Навукова-папулярны фільм (М). 17.00 — першынство свету па футболу. ГДР—Аўстрыя. Адборачны матч. Перадача з Лейпцыга. 17.50 — па роднай краіне. «Карпацкі эцюд». Кінанарыс. 18.00 — наш кінаглобус. «Краіна старажытнай культуры». Дакументальны фільм. 18.50 — «Восень у Кліне». Музычная перадача (М). 19.30 — «Святло і цені». Міжнародная праграма (М). 20.00 — «Чырвоныя бярэзы». Мастацкі фільм (М). 21.30 — канцэрт Галіны Вішнеўскай.

Беларускія, рускія, украінскія, малдаўскія, польскія, венгерскія, румынскія танцы выконваюць самадзейныя артысты народнага ансамбля танца Мінскага трактарнага завода. Удзельнікі ансамбля часта выступаюць перад рабочымі і служачымі сталіцы, неаднаразова выязджалі ў сталіцу нашай Радзімы — Маскву і гарады суседніх рэспублік.

На здымку — руская пляска «На вуліцы шырокай» у выкананні ансамбля танца.

ЭЦЮДЫ З Н-СКАЙ ЧАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Так точна!..—моцна, як толькі мог, адказаў ён. Адзін на ўсю залу.

Злева, у кутку, нехта засмяяўся.

Вось тут і пачалося. Хай бы ён, Касымаў, лепш памаўчаў. Камандзір часці ўсміхнуўся і глядзеў цяпер толькі на яго, Касымава.

— Адразу відаць, што дома быў. Голас вунь які... Паслухаць толькі...— камандзір памаўчаў, задумаўшыся, быццам не адважваючыся чагосьці сказаць. Пасля раптам загаварыў:— Добрая гэта штука—пабыць дома. А помніш, Касымаў, як ты прыходзіў прасіцца? Трэба было табе дамоў, трэба... І служыш ты добра...

— На дзень раней з дому прыехаў...—падказалі з залы некалькі галасоў.

— Вось бачыш... З'ездзіў, на дзень раней вярнуўся, а да мяне не зайшоў. Не хацеў я пра гэта гаварыць пры ўсіх, яно, можа, і не варта было. Ты ж мне не павінен дакладваць асабіста, што з дому вярнуўся. Але калі ўжо на тое пайшло—скажу... Я ўсё-такі чакаў цябе. Думаю, прыйдзе. Дарогу да мяне ўжо ведае. Прыходзіў жа прасіцца. Думаю, зойдзе і скажа: вярнуўся, вось, са свайго Азербайджана. Дзякуй. Дома тое і тое. Так і так жывуць. Вось паслухайце, што ў нас новага... Думаеце, мне гэта не цікава? Думаеце, мне з вамі пагаварыць няма пра што? А вось не прыйшоў. Што, Касымаў, схіліў галаву? Ды я на цябе не пакрыўдзіўся... Чаго ўжо тут... Проста так. Да слова прыйшлося...

...Салдаты хутка пакідалі залу. Збягалі ўніз, на першы паверх, заглядвалі ў Ленінскі пакой, у бібліятэку. Кожную суботу ў вольную хвіліну ў салдат свае клопаты. Ніхто, здавалася, не глядзеў на Касымава, не звяртаў на яго ўвагі, як і заўсёды. А яму падалося, што на яго цяпер толькі ўсе і глядзяць, толькі пра яго і думаюць: вунь які ён, Касымаў...

Ён доўга стаяў у калідоры, стараючыся не трапіцца нікому на вочы. Пасля яму падумалася, што камандзір часці сказаў праўду, і што да яго ён, Касымаў, зойдзе калі-небудзь. Возьме і зойдзе. Нічога, што пра гэта напомніў сам камандзір.

Вось толькі падбярэ час...

З. БУЛЬБА

Над лесам, дзе дрыжала густая сінеча і дзе падымаліся і паўзлі высока ў неба дымы над горадам, узышло сонца. А там, дзе ўчора вечарам на захадзе слалася хмара — гэта ў бок ракі,— цяпер распаўзліся ля самай зямлі доўгія ружовыя палосы. Яны былі яркія і, здавалася, вострыя,—на вецер.

Над дарогай, дзе яны нядаўна ехалі, яшчэ вісеў пыл,—курыўся і асядаў на полі. Адсюль, ад самага лесу, было відаць далёка,— аж да шашы ў прысадах. Відаць было і як хадзілі кучкай салдаты за дарогай, згіналіся над баразнамі і перастаўлялі з месца на месца вялікія кошыкі з лазы.

Пасля салдаты разышліся па ўсім полі.

Ён, Вярбіцкі, быў з рыдлёўкай. З вялікай, на доўгай ручцы. Ёй зручна было разбіваць дзернякі; бульбу можна было кідаць адразу ў кошык, а можна было і, заходзячы далёка наперад, складваць яе проста на зямлю ў кучку, як рабіў гэта сяржант Анмегікян.

Калі ён, Вярбіцкі, адгінаўся ад зямлі, чуў, як на лагу, у самым канцы бульбянішча, стукае рухавічок; пасля адтуль даляцела з рэпрадуктара песня. Гэта салдаты з іхняга аддзялення прывезлі з сабой рухавічок — прыехалі раней за ўсіх.

Яму, Вярбіцкаму, успомнілася чамусьці, што, калі яны збіраліся раніцай ехаць выбіраць бульбу, у суседзяў быў агляд страявой песні. Успомнілася, як яшчэ ў суботу ў курылку да іх прыйшоў сяржант Анмегікян і сказаў, што яны едуць на бульбу. Проста так і сказаў: «Паедзем на бульбу». Не склікалі ні камсамольскага сходу, не пісалі пратакола. І салдаты паехалі. Салдаты любяць працаваць.

Падняўся вецер, падзьмуў з лагчыны. Здалося, што спяваюць зусім побач:

Как тебе служится, с кем тебе дружится
В дальнем твоем далеке?..

Успомніўся дом. Можа пра яго нагадала сёння не песня, а гэта поле з пасохлай травой і парыжэлым бульбоўнікам... Такое ж поле ўвосень дома, у вёсцы Чарвякі за Вілейкай. Бацька яго, як і ён, Міхась Вярбіцкі, быў да арміі ў саўгасе. Піша, што ўраджай у Чарвяках сёлета добры, што многа работы і што дома добра зарабляюць. Міхась і сам, калі прыязджаў дамоў у кароткатэрміновы водпуск, бачыў гэта на свае вочы.

Ён падумаў пасля, што пайшлі апошнія месяцы службы, што хутка вернецца дадому, у саўгас. Ён шофер, але шафёры цяпер «не модныя», і ён ловіць сябе на тым, што яму хочацца вучыцца. Вунь як хочацца... Можа таму, што ў яго толькі за плячыма сем класаў...

Калі ён думае, што хутка вернецца дадому, яму робіцца сумна. Тут, у гарадку, прайшлі тры гады. Тут ён ужо як дома. Усіх ведае, і яго ўсе ведаюць. І зямля тут, як у іх дома, у саўгасе...

Далёка на той бок дарогі смяюцца салдаты,— на ўсё поле. Стукае і стукае рухавічок і не сціхае песня. Сухі ад сонца вецер сушыць твар і нясе з сабою пах сыраватай, ускопанай зямлі. Бывае здараецца, што зямлёй пахне ўсё: і вецер, і бульба, і трава ў лагчыне ля дарогі, і морква ў руках у хлопцаў, памытая ў вадзе ці проста выцертая аб траву... І хочацца тады ісці і ісці баразной, не адгінаючыся, было б толькі ў што сыпаць бульбу...

І думаецца тады яму, Вярбіцкаму, што праўду кажа заўсёды афіцэр Базарскі, калі гаворыць, што салдаты любяць працаваць у калгасе...

Базарскі і сам на полі, разам з усімі. Стаяў ля машыны, размаўляў з камандзірам, які толькі што прыехаў, пасля пайшоў цераз поле да далёкай кучкі салдат.

Салдаты за дарогай набліжаюцца да самага лесу, дзе стукае рухавічок. Пасля яны ўсе пяройдуць на гэты бок. Да полудня выберуць бульбу і тут, ля самай лагчыны.

Час ідзе следам за сонцам, і думаецца, што сёння нядзеля, што трэба будзе яшчэ схадзіць ва «Усход-4» да Абасава. Гэта ён, грамадскі прадавец кніжнага магазіна (магазін у іх назвалі «Усход-4»), абяцаў прывезці з горада патрэбныя кнігі. Успомнілася яшчэ, што ляжыць у тумбачцы недачытаны раман Мухтара Ауэзава «Шлях Абая» і што ўвечары ён, Вярбіцкі, пойдзе ў горад. Сходзіць у тэатр.

...У поўдзень вецер сціх. Сонца высушыла дарогу, і з-пад ботаў падымаўся пыл.

Салдаты сталі ля дарогі. Вясёлыя, неспакойныя. І яму, Вярбіцкаму, здалося, што яны яшчэ больш загарэлі гэтым асеннім днём.

Калі выехала на дарогу машына, ён убачыў, як з лагчыны паднялася чорная стайка шпакоў, праляцела над іржышчам і села на шэрую ўзараную зямлю.

Па калдобіністай, у рытвінах дарозе яны выехалі на шашу.

Ззаду засталося асенняе поле, пустое і шырокае.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 0139